Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 МАЯ 2017 г. ЧАЦВЕР № 87 (28451)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Золата нашай нацыі**



**«Крылы анёлаў»: каб паверыць у сябе**



**Кітайскія паэты — па-беларуску**

СТАР. 13

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Ірына СТАРАВОЙТАВА, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:**

*«Якой мы выхаваем моладзь — ад таго будзе залежаць заўтрашні дзень нашай дзяржавы. Важна ёй не толькі гаварыць пра тое, што трэба любіць Радзіму, а каб маладыя людзі былі самі актыўнымі ўдзельнікамі ва ўсіх працэсах, якія адбываюцца ў краіне, і кожны з іх мог зрабіць нешта карыснае для грамадства. Важна, каб яны даследавалі, вывучалі жыццё сваякоў, сваіх продкаў, якія ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне і працавалі над аднаўленнем краіны ў пасляваенны няпросты час, і праз гэта таксама прыходзілі да разумення цаны подзвігу беларускага народа».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.05.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8855 | ▼ |
| Еўра | 2,0520 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0324 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0712 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# З сонейкам — па жыцці



Фота БЕЛТА.

Маладая сям'я Аляксандра і Кацярыны МІГАЛЯЎ з Гомеля.

## Дэсант на верталёце

### Карэспандэнты «Звязды» ўзялі ўдзел у вучэннях МНС

**У пяціпавярховым доме прагрымеў моцны выбух, прычынай якога стаў бытавы газ. Абрынуўся адзін з пад'ездаў, узнік пажар. Пад заваламі — некалькі людзей. Тыя, каму пашчасціла аказацца на верхніх паверхах, выбеглі на дах і прасілі аб дапамозе. На месца падзей выехалі чатыры аўтамабілі ратаўнікоў, сярод якіх быў кінолаг. Пацярпелых аператыўна дасталі з-пад завалаў і разам з заблакіраванымі на верхніх паверхах эвакуіравалі на верталёце...**

А праз некалькі хвілін з рэек сышла чыгуначная цыстэрна. Больш таго, яна часткова разбурылася, а з пашкоджанай ёмістасці пачаў выцякаць небяспечны рэагент. Тут жа да месца катастрофы прыбыло некалькі аўтамабіляў МНС, сярод іх была машына радыяцыйна-хімічнай абароны і цыстэрны. Месца здарэння тут жа было лакалізавана, а рэагент пачаў адпампоўвацца ў адмысловую ёмістасць. Ліквідаваць наступствы аварыі высадзіўся з верталёта Мі-8 дэсант ратаўнікоў...

СТАР. 4



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

■ Арэнда жылля

## ШУКАЮ ТАННЕЙШЫ ПАКОЙЧЫК

### Спецыялісты прагназуюць актывізацыю рынку здымнага жылля ў сталіцы толькі з трэцяй дэкады мая

**Сёлетняя вясна на другасным рынку прыватнай арэнды пакуль не стала спрыяльным сезонам для кватэраздатчыкаў. Мінулая зіма ўвогуле была складаным перыядам для ўласнікаў свабоднага жылля, бо колькасць кліентаў у гэты час не павялічылася, заробкі ў патэцыйных кватарантаў не падраслі, а вось тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі пайшлі ўгору.**

**Пра сённяшнюю сітуацыю на сталічным рынку арэнды і прагнозы на найбліжэйшую перспектыву карэспандэнту «Звязды» расказала начальнік аддзела арэнды агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Маргарыта ПАЧЫЦКАЯ.**

### ПОПЫТ БУДЗЕ РАСЦІ

Нагадаю, што за апошнія два гады цэны за арэнду стандартнага жылля ў Мінску зваліліся амаль у разы. Так, калі вясной 2015-га звычайныя аднапакаёвыя кватэры прапаноўваліся ў самым лепшым выпадку (для кватарантаў) за 300 долараў, то сёння падобнае жыллё здаецца не даражэй чым за 160—180 «баксаў». Больш таго, цэны на арэнду зімой і нават у першыя месяцы вясны толькі зніжаліся. Сітуацыя можа змяніцца ў апошнія дні мая, калі арэcaptnымі кватэрамі Мінска пачнуць больш актыўна цікавіцца будучыя абітурыенты розных навучальных устаноў сталіцы, а таксама іх бацькі. Спецыялісты прыватнага рынку арэнды менавіта ў першыя дні лета чакаюць невялікую хвалю іншагародніх маладых спецыялістаў, якія вырашылі застацца працаваць у Мінску.

СТАР. 4

■ Блізкая ўлада

# «Абяцай, калі можаш выканаць»

**Падчас прамой лініі старшыня Баранавіцкага райвыканкама Васіль ХВАЦІК выслухаў як звыклыя пытанні па працаўладкаванні і добраўпарадкаванні, так і некалькі іншых праблем, што хвалююць жыхароў раёна.**

За першую гадзіну патэлефанавала чатыры чалавекі. У адным выпадку трэба было растлумачыць асаблівасці прыватызацыі жылля. Другі званок прыйшоў ад жыхароў вёскі — прасілі адрамантаваць мост цераз рэчку. Як растлумачыў старшыня, у вёсцы жывуць пераважна старыя людзі. Драўляная кладцы, па якой яны прывыклі хадзіць, патрэбен рамонт, тут без пытанняў трэба дапамагчы. Яшчэ адна сітуацыя — спрэчка з кааператывам. Дзесяць гадоў таму ў пасёлку пракладвалі газавы трубаправод. У такім выпадку 70 працэнтаў ад кошту работ аплачвае дзяржаўны бюджэт, 30 працэнтаў — уласнікі дамоў. Каб працэдура праходзіла лягчэй, зацікаўленыя ў гэтым жыхары аб'ядналіся ў кааператыў. Цяпер да праведзенай трубы вырашылі падключыцца яшчэ колькі вяскоўцаў. Вось толькі пры гэтым ім трэба заплаціць пэўную суму, якую ў свой час аддаў кожны з удзельнікаў кааператыву. Старшыня аб'яднання прапанавала, каб сабраныя пазней грошы паслужылі для рэканструкцыі царквы. Навічкі ж гэтага не хочуць і ўвогуле стараюцца выплат пазбегнуць.

— Спрабую растлумачыць людзям, што так нельга, што гэта заканадаўчае патрабаванне, — кажа Васіль Хвацік. — Пытанні, калі разам з чалавекам трэба разбірацца ў заканадаўчых нормах, безумоўна, сустракаюцца, але часцей за ўсё людзі просяць канкрэтнай дапамогі. Думаю, што і на гэтай прамой лініі прагучыць зварот па ўпарадкаванні вуліц. У нас большасць дарог у сельскай мясцовасці, з грунтовым пакрыццём. Падчас дажджоў яго хутка размывае. Як правіла, людзі разумеюць, што пакласці асфальт у далёкай вёсцы вельмі затратна, таму просяць прыслаць грэйдар, каб маглі праехаць «хуткая» ці аўталаўка.



**«Самая страшная хвароба чыноўнікаў — паабяцаць і не стрымаць свае слова. Можаш вырашыць праблему — называй пэўную дату і бяры на кантроль».**

Яшчэ адно звыклае пытанне — працаўладкаванне. Малады чалавек просіць пашукаць вакансію. Як аказалася, Артур скончыў дзевяць класаў і цяпер ніяк не можа ўладкавацца на работу. Ён запэўнівае, што гатовы на любую справу хоць у горадзе, хоць у вёсцы, абы было пастаяннае месца і жыллё. Пасля спробы больш пэўна растлумачыць сітуацыю суразмоўца вырашае, што лепей падысці да старшыні на асабісты прыём.

— Даволі складаны выпадак, — каментуе кіраўнік райвыканкама. — Малады чалавек без спецыяльнай адукацыі, без жылля — не трэба асабліва здзіўляцца, што ўзніклі праблемы з працаўладкаваннем. Нават у сельскай гаспадарцы цяпер патрэбны пэўныя веды па прафесіі. З другога боку, ёсць жаданне знайсці работу, гэта ўжо нямала. Куды горш, калі вялікаўзроставыя «дзеці» нідзе не працуюць, жывуць на бацькоўскую пенсію, да таго ж вядуць асацыяльны лад жыцця... Тады і здараецца непрыемная сітуацыя, калі старыя бацькі робяць за сваіх дзяцей выплаты па дэкрэце №3... Як бы там ні было, але старшыні сельскіх Саветаў ужо папярэджаны аб тым, каб браць падобныя выпадкі на кантроль.

Наогул, па словах старшыні, званкоў у райвыканкам стала менш. Напэўна, іграе ролю і тое, што работа з насельніцтвам адбываецца кожны дзень, а не толькі па суботах.

— Самая страшная хвароба чыноўнікаў — паабяцаць і не стрымаць свае слова. Можаш вырашыць праблему — называй пэўную дату і бяры на кантроль. Калі праблема доўгатэрміновая і сродкаў на яе адразу выдзеліць не ўдасца, лепей так і растлумачыць людзям, як бы непрыемна гэта ні было. Напрыклад, капітальны рамонт будынкаў распісаны ў плане. Раней жыхары тэлефанавалі і пыталіся, а цяпер ведаюць, што работы адбудуцца не «калі-небудзь», а ў сваю чаргу.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

# МОЛАДЗЬ ВЫРАШАЕ

## У Савеце Рэспублікі адбыўся «Адкрыты дыялог» сенатараў з піянерамі

**Марыяна ШЧОТКІНА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, разам з парламентарыямі адказала на пытанні падлеткаў, якія прыехалі з усёй краіны. Сёлета Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя адзначае свае 95-годдзе. Святкаваць будуць 19 мая. У тыя ж дні пройдзе міжнародны злёт «Заўсёды гатовы!», на які прыедуць маладзёжныя дэлегацыі з Расіі, Казахстана і іншых краін.**

Дарэчы, на прасторы СНД Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя з'яўляецца самай вялікай па колькасці ўдзельнікаў – у яе ўваходзяць каля 650 000 школьнікаў.

**Вікторыя МЕНАНАВА, старшыня Цэнтральнага савета БРПА**, расказала, што дзецям, якія прыехалі ў Савет Рэспублікі, цікава даведацца, наколькі складана быць палітыкам.

— Моладзь — гэта патэнцыял кожнай краіны. І развіццё дзяржавы не магчыма без развіцця маладзёжнага руху, — адзначыла Марыяна Шчоткіна. — Мы ўскладаем надзеі на моладзь, таму што гэта тыя людзі, якія будуць кіраваць краінай, ад іх будзе залежаць лёс дзяржавы і будучых пакаленняў. І, вядома, абмеркаванне з імі праблем, якія існуюць у краіне, развіцця маладзёжнага парламентарызму, іх непасрэдны ўдзел у прыняцці рашэнняў, — гэта вельмі важна. Шчырая размова, дыскусія, адкрыты дыялог — адзіная магчымасць прымаць правільныя рашэнні.

Марыяна Шчоткіна згадала, што піянеры ў часы Вялікай Айчыннай вайны ўжо станавіліся Героямі Савецкага Саюза. «Наша моладзь — таксама жыве ў нашай краіне, любіць яе. Ім ёсць што прапанаваць, і, як паказвае гісторыя, яны выконваюць велізарную ролю ў развіцці і ў гісторыі краіны».

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У Расіі прапанавалі ўвесці падатак на маладзетнасць

Адпаведны пункт змяшчаецца ў канцэпцыі федэральнага закона «Аб статусе шматдзетных сем'яў», накіраванай прэзідэнту Расіі Уладзіміру Пуціну. Дакумент распрацаваў дырэктар Інстытута дэмаграфіі, міграцыі і рэгіянальнага развіцця Юрый Крупноў.

Падаткам павінны быць абкладзены сем'і з адным дзіцем, а таксама тыя, што не маюць дзяцей не па медыцынскіх паказаннях. Велічыня збору пакуль не вызначана.

Дакумент прапануе шэраг іншых мер, накіраваных на падтрымку шматдзетных сем'яў. У прыватнасці, мяркуецца прыраўняць дзейнасць па выхаванні дзяцей да працоўнага стажу. Плануецца таксама даць шматдзетным сем'ям права на бясплатны зямельны ўчастак з камунікацыямі і ўстанавіць штомесячныя грашовыя выплаты ў памеры ад 25 да 100 тысяч расійскіх рублёў (каля 13—53 тысяч долараў) у залежнасці ад колькасці дзяцей.

### У Малдове скароцяць амаль палову міністэрстваў

На думку старшыні кіруючай Дэмакратычнай партыі Уладзіміра Плахатнюка, рэформа дазволіць знізіць узровень бюракратыі і карупцыі.

«Рэформа дасць магчымасць павысіць эфектыўнасць урада, знізіць узровень бюракратыі і карупцыі», — сказаў Плахатнюк. Ён запатрабаваў ад прэм'ер-міністра Паўла Філіпа пачаць яе ўкараненне ўжо ў найбліжэйшыя тыдні.

Па словах Плахатнюка, адной з галоўных праблем цяперашняга кабінета з'яўляецца дзялежванне палітычнымі партыямі міністры. «Неабходна скончыць з дзяльбой міністэрстваў паміж партыямі. Ва ўрадзе павінны працаваць прафесіяналы», — удакладніў лідар ДПМ, выказаўшы надзею, што парламент паставіцца да гэтага з разуменнем.

### Трампа правераць



Спецыяльны камітэт па разведцы Сената Кангрэса ЗША звярнуўся ў міністэрства фінансаў за поўнай інфармацыяй аб дзеловых сувязях прэзідэнта Дональда Трампа, яго былых і дзеючых памочнікаў, паведаміў тэлекампаніі CNN самы старэйшы дэмакрат у камітэце, сенатар Марк Уорнэр.

«Мы накіравалі запыт у аддзел крымінальных расследаванняў мінфіна з мэтай забяспечыць выніковасць нашых спроб праверыць усю разведвальную інфармацыю, куды б яна нас ні прывяла», — заявіў Уорнэр. Паводле яго слоў, камітэт зацікаўлены ў тым, каб атрымаць ад ведамства звесткі пра «наяўнасць і ўзровень фінансавых сувязяў» былых і дзеючых памочнікаў, дарадцаў Трампа, а таксама супрацоўнікаў яго адміністрацыі. «Інфармацыя можа паказваць, куды ідуць грошы, прычым не абавязкова з Расіі», — дадаў сенатар.

У аўторак на рэгулярным брыфінгу для журналістаў прэс-сакратар Белага дома Шон Спайсер чарговы раз заявіў, што прэзідэнт Трамп не мае ні бізнесу ў Расіі, ні сувязяў з Масквой. Такім чынам ён пракаментаваў выказванні члена Сената Кангрэса ЗША Ліндсі Грэма пра намер вывучыць пытанне аб тым, ці ёсць у Трампа, які да перамогі на прэзідэнцкіх выбарах быў буйным прыватным прадпрымальнікам-мільярдэрам, нейкія дзелавыя сувязі з Расіяй.

■ Меркаванне



# Што азначае перамога Макрона для будучыні ЕС?

**У мінулую нядзелю ў Францыі прайшоў другі тур выбараў прэзідэнта краіны. Былы міністр эканомікі Эмануэль Макрон, які стварыў і ўзначаліў рух «Наперад!», узяў верх з вынікам 66,1%. За яго выказалася больш як 20,7 мільёна выбаршчыкаў. Лідар партыі «Нацыянальны фронт» Марын Ле Пэн атрымала астатнія 10,6 мільёна галасоў — гэта 33,9%.**

Вынікі выбараў нельга назваць сенсацыяй. Яны былі зразумелыя ўжо па заканчэнні першага тура, калі Макрону ўдалося прабіцца ў фінал разам з Ле Пэн. Менавіта тады гэта было найважнейшай навіной для прыхільнікаў ЕС — калі б Макрон не прайшоў, то сапернікам Ле Пэн мог бы стаць адзін з кандыдатаў, якія выказваліся супраць удзелу Францыі ў саюзе. І тады няважна, хто б перамог у гэтую нядзелю, — абое прэтэндэнты маглі б правесці рэферэндум аб выхадзе Францыі з Еўрасаюза, хто б з іх ні стаў прэзідэнтам. Сам жа Макрон не бярэ пад сумненне членства Францыі ў ЕС.

У той жа час не ўсё так проста. Нідэрландскія і французскія выбары ў першай палове 2017 года разглядаліся элітамі ЕС па галоўным параметры — ці не з'явяцца там ва ўладзе сілы, якія будуць настроены пераняць прыклад Вялікабрытаніі. Некаторымі гэтая пагроза ўспрымалася як рэальная магчымасць краху Еўрасаюза, бо менавіта ў Францыі і Нідэрландах у 2005 годзе нядаўна прайшлі вельмі важныя рэферэндумы, дзе насельніцтва адхіліла Канстытуцыю ЕС, якая прадугледжвае далейшую цэнтралізацыю гэтага інтэграцыйнага аб'яднання. З тых часоў ЕС вымушаны жыць без сваёй Канстытуцыі і таксама адмовіцца ад планаў па цэнтралізацыі. Але сама пастаноўка пытання сведчыць пра тое, што Еўрасаюз знаходзіцца ў глыбокім крызісе, калі галоўным пытаннем становяцца не перспектывы далейшага развіцця, а сур'ёзна разглядаецца магчымасць выхаду вельмі важных удзельнікаў. З гэтага боку перамога праціўнікаў еўраінтэграцыі ў Нідэрландах магла стаць сігналам да пачатку панікі аб магчымасці краху ЕС і заразліва паўплываць на вынік выбарчай кампаніі ў Францыі.

Цяпер страхі засталіся ў мінулым, па выніках выбараў у абедзвюх краінах ва ўладзе няма прыхільнікаў выхаду з ЕС. Асабліва важныя вынікі прэзідэнцкіх выбараў у Францыі, паколькі без яе Еўрапейскі саюз не быў бы такім, як цяпер. Менавіта французска-германскія дамоўленасці ў 1950-х гадах паклалі пачатак старту інтэграцыі, Францыя на фоне выхаду Вялікабрытаніі будзе другой па памеры насельніцтва і эканомікі краінай ЕС пасля Германіі. Якія ж будуць дзеянні Макрона як прэзідэнта краіны, і ці пасуюць гэта інтарэсам захавання і развіцця Еўрасаюза?

Аб контурах будучай палітыкі можна меркаваць па краінах, з лідарамі якіх пасля перамогі на выбарах Эмануэль Макрон пагутарыў, — гэта ЗША, Вялікабрытанія, Германія, Турцыя і Канада. Тры з іх — ЗША, Вялікабрытанія і Канада — з'яўляюцца найбліжэйшымі саюзнікамі па НАТА. Вялікабрытанія і Канада таксама лічацца найважнейшымі і найбліжэйшымі саюзнікамі ЗША, пры гэтым у Канадзе значны ўплыў на ўнутраныя справы краіны аказвае франкамоўны Квебек. Гэты кірунак перагавораў сведчыць, што новы прэзідэнт не плануе мяняць існуючую атлантычную арыентацыю Францыі, якая захоўвалася пры яго папярэдніку Аландзе, і амерыканацэнтрычны свет яго задавальняе. Праблема ў тым, што свет, цэнтрам якога з'яўляюцца ЗША, прадугледжвае мала самастойных магчымасцяў для ЕС, і, больш за тое, у Вашынгтоне не разглядаюць станоўча спробы цэнтралізацыі Еўрасаюза і праекты па нарошчванні яго ролі ў свеце. Такім чынам, можна меркаваць, што новы прэзідэнт Францыі будзе выступаць не за рэформы па далейшай цэнтралізацыі і ўзмацненні Еўрапейскага саюза, а за захаванне статус-кво. Але гэта азначае, што ЕС застанецца на небяспечнай стадыі частковай цэнтралізацыі, менавіта ў тым стане, калі сталі магчымымі ўцёкі з яго Вялікабрытаніі, што не выключае ў будучыні новых падобных праяў.

Перагаворы з Германіяй як найважнейшай краінай у ЕС таксама зразумелыя. Макрон супакоіў сваіх германскіх калег у тым, што Парыж застаецца верным саюзнікам Берліна ў прасоўванні сумесных інтарэсаў.

Званок у Турцыю сведчыць, што ў новага прэзідэнта Францыі ёсць свае амбіцыі па ўрэгуляванні адразу трох пытанняў — крызісу з наплывам бежанцаў, барацьбе з «Ісламскай дзяржавай» і сірыйскай вайне. Усе тры праблемы ўяўляюць сур'ёзныя цяжкасці для Еўрасаюза і самой Францыі, і тут роля Макрона можа быць дастаткова вялікая. Тым больш што Францыя, у сілу сваёй геаграфіі, заўсёды прэтэндавала на лідзіруючую ролю адносна паўднёвых суседзяў ЕС.

У Маскву Макрон не патэлефанаваў, і гэта таксама сігнал. Але негатыўны. Тым больш што новы лідар Францыі пакрыўджаны на хакерскую атаку на яго выбарчы штаб, якая адбылася напярэдадні выбараў і якую ў заходніх СМІ прыпісваюць Маскве.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук**

■ Фінансы

## Золатавалютныя рэзервы павялічыліся да 5,1 млрд долараў

**За чатыры месяцы года золатавалютныя рэзервы Беларусі ў адпаведнасці з метадалогіяй Міжнароднага валютнага фонду (МВФ) выраслі на 3,7%. Па стане на 1 мая яны склалі 5 млрд 108,7 млн долараў (у эквіваленце), паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка.**

Фінансісты адзначаюць, што толькі за красавік нашы рэзервы ўзраслі на 92,6 млн долараў (на 1,8%) пасля зніжэння ў сакавіку на 6,2 млн долараў (на 0,1%). У нацыянальным вызначэнні аб'ём золатавалютных рэзерваў на 1 мая склаў 5 млрд 672 млн долараў, або павялічыўся за красавік на 263 млн долараў (на 4,9%). З пачатку года ЗВР у нацыянальным вызначэнні выраслі на 487,5 млн долараў.

У прэс-службе Нацбанка паведамляюць, што павелічэнню золатавалютных рэзерваў у красавіку спрыялі паступленне трэцяга траншу фінансавага крэдыту Еўразійскага фонду стабілізацыі і развіцця, купля рэгулятарам замежнай валюты на таргах Беларускай валютна-фондавай біржы, прыцягненне сродкаў ад продажу Міністэрствам фінансаў і Нацыянальным банкам аблігацый, намінаваных у замежнай валюце, паступленні ад збірання экспартных пошлін на нафту і нафтапрадукты, а таксама рост цаны золата на міжнародным рынку каштоўных металаў. Адмоўны ўплыў на дынаміку рэзерваў аказала планавае пагашэнне ўрадам і Нацбанкам знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце.

Эксперты банка нагадваюць, што за мінулы год золатавалютныя рэзервы краіны ў вызначэнні МВФ павялічыліся на 751,4 млн долараў (на 18%) (у эквіваленце) на 1 студзеня 2017 года. Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі на 2017 год прадугледжаны рост золатавалютных рэзерваў не менш як на 500 млн долараў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Майце на ўвазе!

## Пуцёвак можа не хапіць

**Адпачынак у беларускіх санаторыях карыстаецца стабільным попытам у замежных грамадзян.**

Пра гэта паведаміў **дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні Генадзь БАЛБАТОЎСКІ**. Так, за першы квартал у нашу краіну папраўвіць здароўе прыехала гасцей на дзве тысячы больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Адпаведна, прырост выручкі склаў 26 працэнтаў. Усё больш становяцца запатрабаванымі і дадатковыя паслугі, якія не ўваходзяць у кошт пуцёўкі. Між іншым, сёння ў нашай краіне практычна няма санаторыяў, якія б аказвалі менш за дзвесце відаў паслуг.

Людзям, якія ў летні час хочуць заняцца сваім здароўем, пра адпачынак трэба паклапаціцца загадзя. Так, у санаторыях Цэнтркурорта ўжо забраніравана і прададзена на чэрвень 75 працэнтаў пуцёвак, ліпень — 85, жнівень — каля 80.

Трэба сказаць, што на гэты год не прагназуецца вялікага росту кошту на падобны адпачынак. Так, у сярэднім дзень у санаторыі не павінен абысціся больш чым у 55 рублёў. Па выніках першага квартала, койка-месца адпачывальнікам каштавала 46 рублёў, прычым у лютым цэны на пуцёўкі нават былі зніжаны ў параўнанні са снежнем.

Тым, хто не гатовы набыць пуцёўку на поўны курс лячэння, санаторыі могуць прапанаваць туры выхаднога дня са скарочанай аздараўленчай праграмай. Між іншым, з увядзеннем бязвізавага рэжыму ў Белавежскай пушчы і на Гродзеншчыне павялічыўся попыт на такія паслугі з боку найбліжэйшых нашых суседзяў.

Ствараюцца ў нашай краіне і спрыяльныя ўмовы для летняга адпачынку дзяцей. Так, на правядзенне летняй аздараўленчай кампаніі ў 2017 годзе з рэспубліканскага бюджэту будзе выдзелена больш за 37 мільёнаў рублёў, у тым ліку каля паўмільёна — на падрыхтоўку стацыянарных летнікаў. Памер датацыі на дзіцячыя пуцёўкі ў гэтым годзе ў сярэднім павялічаны на 9 працэнтаў.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні члену Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах Ніжэвіч Людміле Іванаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**Калектыў ААТ «Паліграфкамбінат імя Якуба Коласа» выказвае глыбокія спачуванні родным і блізкім у сувязі са смерцю МАЧУЛЬСКАГА Уладзіслава Антонавіча.**

**Калектыў УП «Мастацкая літаратура» смуткуе з выпадку заўчаснай смерці былога дырэктара выдавецтва МАЧУЛЬСКАГА Уладзіслава Антонавіча і выказвае глыбокія спачуванні яго родным і блізкім у сувязі з напаткаўшым вялікім горам.**

**Кіраўніцтва і калектыў выдавецтва «Народная асвета» выказваюць глыбокія спачуванні родным і блізкім з нагоды заўчаснага скону МАЧУЛЬСКАГА Уладзіслава Антонавіча. Смуткуем разам з вамі.**

# ПАДАРУНКІ ВЕТЭРАНАМ



**У гэтыя пераможныя майскія дні ветэранаў наведваюць і народныя абраннікі. Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Анатоль Хішчанка разам з прадстаўніком мінскай кампаніі «НВП Белсофт» Аленай Маскалік прывезлі падарункі для Магілёўскага спецыяльнага дома для ветэранаў, састарэлых і інвалідаў. А Анатоль Хішчанка асабіста паклапаціўся купіць тутэйшым жыхарам павелічальныя лупы. На апошняй сустрэчы нехта з іх агучыў гэтую просьбу.**

— Мы вельмі рады чымсьці быць карысныя гэтым людзям, — кажа Анатоль Хішчанка. — Для нас ужо стала традыцыяй прыязджаць сюды. Апошні раз сустракаліся на Новы год. Ну а Дзень Перамогі наогул вялікае свята. Тым больш, што тут жывуць людзі, якія набліжалі гэты дзень. Мы перад імі схіляем галовы і дзякуем за ўсё.

З 230 чалавек, якія сёння жывуць у Доме ветэранаў, 31 удзельнік вайны і 7 былых вязняў. Тут таксама знайшлі прытулак сем'і загінулых, інваліды Савецкай Арміі і іншыя грамадзяне з сацыяльна неабароненых катэгорый. Дырэктар установы Наталля Банькоўская запэўнівае, што любыя знакі ўвагі вельмі важныя для гэтых людзей. І прыемна, што ёсць людзі і дабрачынныя арганізацыі, якія, некаторыя нават інкогніта, не забываюць дарыць ім радасць.

Ветэраны ў сваю чаргу аддзячылі прыехаўшым да іх дабрадзеям шчырай песняй. Тут ёсць свой хор, які добра падымае настрой на падобных мерапрыемствах.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Мы і птушкі

# На Палессе прыляцеў сібірскі чакан

**Новы для краіны від птушак — сібірскі чорнагаловы чакан — быў адзначаны арнітолагамі ў Беларусі 5 мая, паведамілі журналісту «Звязды» ў грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ). І гэта пры тым, што птушка гняздуецца пад Архангельскам і ў заходняй Сібіры, а зімуе ў Індыі!**

Незвычайная птушка трапіла ў аб'ектыў фатографа з Палесся Андрэя Шэўчыка. Чакан прызямліўся ў пойме ракі Ненач Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Да гэтага часу сібірскага чакана ў Беларусі афіцыйна не адзначалі ніколі. З навакольных краін яго бачылі ўсяго адзін раз у Літве (17 гадоў таму) і два разы ў Польшчы (кастрычнік 2016-га і май 2015-га).

Часцей за ўсё арнітолагі і бёрдвотчары сустракаюць тыя новыя для Беларусі віды птушак, якія сустракаліся ўжо ў краінах-суседках. У Беларусі дагэтуль былі зарэгістраваны два віды чаканаў:



звычайны лугавы і каля 16 гадоў таму краіну з поўдня стаў засяляць чорнагаловы чакан, які ў Заходнім Палессі гняздуецца цяпер рэгулярна.

— З'яўленне ў нашай краіне такога віду, як сібірскі чорнагаловы чакан, было цяжка прадказаць. Гэты від жыве ў паўночна-ўсходняй частцы еўрапейскай Расіі і Заходняй Сібіры. Зімуе ў Індыі і Тайландзе. Яго міграцыйныя шляхі праходзяць далёка ад Беларусі. Гэты чакан заляцеў выпадкова. Але ёсць шанцы, што пасля перадышкі на Палессі птушка вернецца ў Сібір. Некаторым крылатым уласцівыя рызыкоўныя прыгоды, такім чынам выпадкова яны могуць знайсці новыя прыдатныя зоны для рассялення. Успомніце беларускіх зязюль, перамяшчэнні якіх з перадатчыкамі на працягу 3 гадоў адсочвала наша арганізацыя анлайн: дзве з 15 птушак замест традыцыйнага шляху вяртання на Радзіму ў Беларусь з Паўднёвай Афрыкі праз Егіпет паляцелі ў Жыткавіцкі раён праз Іспанію! Магчыма, што і гэта птушка стала такім жа разведчыкам, — каментуе з'яву **дырэктар АПБ Аляксандр ВІНЧЭЎСКІ.**

Афіцыйна правільнае вызначэнне сібірскага чорнагаловага чакана павінна пацвердзіць БАФК (Беларуская арніта-фаўністычная камісія), якая вывучыць фота, апісанне і падрабязнасці сустрэчы з птушкай, толькі пасля яе рашэння новы від унясуць у спіс птушак Беларусі.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Сітуацыя

## Адбылася ўцечка пароў...

**Ранкам 6 мая жыхары брэсцкага мікрараёна Дуброўка адчулі ў паветры пах хлору. Адразу ж у інтэрнэце з'явіліся рэкамендацыі шчыльна зачыняць вокны. Пазней з'явілася афіцыйная інфармацыя аб тым, што ў цэху ААТ «Брэстбытхім» адбылося выдзяленне пароў хімічнага рэчыва. З прыкметамі атручэння ў бальніцу былі дастаўлены слесар прадпрыемства. Пацярпелага адразу памясцілі ў аддзяленне рэанімацыі.**

Супрацоўнікі МНС, якія прыбылі па выкліку, эвакуіравалі работнікаў завода з цэха і прынялі меры па папярэджанні распаўсюджвання пароў. Іншыя супрацоўнікі прадпрыемства не пацярпелі. У першы дзень прадстаўнікі цэнтра гігіены і эпідэміялогіі паведамілі, што за межамі памяшкання завода не выяўлена перавышэння дапушчальных нормаў канцэнтрацыі шкодных рэчываў.

Пазней афіцыйны прадстаўнік УСК па Брэсцкай вобласці Марына Драńькова агучыла асноўную версію следства аб прычынах надзвычайнага здарэння. На думку следчых, уцечку пароў азотнай і артафосфарнай кіслот спраавакавала парушэнне тэхналагічнага працэсу. Кампаненты залліваліся ў рэзервуар памылкова, што прывяло да выдзялення пароў унутры рэзервуара, а пазней да іх пранікнення ў цэх. Праводзіцца далейшыя следчыя дзеянні.

Аўтаматычная метэаралагічная станцыя па вуліцы Паўночнай, якая знаходзіцца за паўтара кіламетра ад завода, перавышэнняў забруджвальных рэчываў не зафіксавала.

Як стала вядома пасля выхадных, пацярпелы слесар выпісаны з бальніцы і пераведзены на амбулаторнае лячэнне.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■ Здарэнні

## Украў з кватэры больш за 17 тысяч долараў

**Супрацоўнікамі ўпраўлення крымінальнага вышуку ГУУС Мінгарвыканкама сумесна з аператыўнікамі Савецкага РУУС сталіцы затрыманы раней судзімы 47-гадовы мінчанін, які пракраўся ў адну з кватэр на вуліцы М. Багдановіча і выкраў адтуль грашовыя сродкі ў памеры 17,1 тысячы долараў ЗША і 40 беларускіх рублёў, якія належалі 25-гадовай жыхарцы сталіцы.**

Як паведамілі ў прэс-службе ГУУС Мінгарвыканкама, у міліцыю звярнулася маці ўласніцы грашовых сродкаў і кватэры. Жанчына паведаміла, што яе дачка ў цяперашні час знаходзіцца за мяжой, а ў кватэры ніхто не пражывае. Яна перыядычна наведвае жыллё — сочыць за парадкам і захаванасцю грашовых сродкаў, якія дачка атрымала ад продажу дарагой іншамаркі. Калі чарговы раз маці зноў вырашыла наведаць кватэру, заўважыла, што дзверы зачыненых толькі на ніжні замок. Гэта насцярожыла жанчыну.

Было ўстаноўлена, што крадзеж здзейсніў 47-гадовы раней судзімы мінчанін, які быў асабіста знаёмы з заяўніцай і яе дачкой. Аказалася, што зламыснік у свой час рабіў у названай кватэры рамонт і прысутнічаў пры ўстаноўцы ўваходных дзвярэй, да якіх прыкладалася некалькі камплектаў ключоў. Адзін з іх затрыманы прысвоіў. Робячы рамонт, мужчына даведаўся ад гаспадыні пра намер прадаць асабістае аўто і ў хуткім часе на працягу перыяд выехаць за мяжу. Вычакаўшы, злачынец скарыстаўся запасным камплектам ключоў і ўкраў грошы. Яму пагражае адказнасць у выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам да 12 гадоў.

## Канфіскавалі кілаграм гашышу

Супрацоўнікі наркакантролю ГУУС Мінгарвыканкама і Фрунзенскага РУУС сталіцы падчас правядзення комплексу аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў па перакрыцці канала пастаўкі наркатычных рэчываў з Расійскай Федэрацыі ў нашу краіну затрымалі 27-гадовага жыхара горада.

У мэтах наступнай рэалізацыі мужчына прывёз у Мінск гашыш. Падчас асабістага надгляду ў яго канфіскавалі кілаграм гэтага наркотыку. Агульны кошт такой вялікай колькасці наркатычнага рэчыва ў Расіі — 20 тысяч долараў, паведамляе прэс-служба ГУУС Мінгарвыканкама. Гэтага гашышу ў пераразліку хапіла б на пяць тысяч разавых доз.

Вядома, што мужчына раней да крымінальнай адказнасці не прыцягваўся, працуе ў адным са сталічных ТАА. За незаконны абарот наркотыкаў мінчаніну пагражае да 15 гадоў пазбаўлення волі.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

# Дэсант на верталёце



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На шчасце, усе гэтыя жахі адбываліся не ў рэальным жыцці. Такімі маштабнымі вучэннямі на палігоне аператыўна-тактычнай падрыхтоўкі МНС «Светлы Гай», што пад Барысавам, завяршыўся V рэспубліканскі конкурс «Студэнты. Бяспека. Будучыня». Праводзіцца ён з мэтай фарміравання свядомага стаўлення да бяспечных паводзін і папулярызацыі здаровага ладу жыцця.

— Ратаўнікі пастаянна ўдасканальваюць сваё майстэрства, — адзначыў **міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір ВАШЧАНКА** пасля заканчэння вучэнняў. — Мяжы дасканаласці, вядома, няма. Але можна адзначыць, што сёння ўсе падраздзяленні міністэрства маюць вельмі высокую падрыхтоўку і здольныя вырашыць усе задачы, якія перад імі пастаўлены. Гэта яны і дэманструюць у жыцці. Але асаблівы прыярытэт мы аддаём моладзі, таму што менавіта юнакі і дзяўчаты падхопяць прафесійную эстафету.

Чацвёрты раз запар конкурс выйграла каманда Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі.

— Сюды я прыязджаю другі раз, — кажа **адзін з пераможцаў Віктар БЯЛОЎ**. — Ідзеі відэаролікаў, планы трэніровак — усё прыдумваем разам. Пра конкурс даведаўся ад хлопца, які ў гэтай камандзе ўдзельнічаў. Але і парог кваліфікацыі высокі — каб трапіць у каманду, даваліся перамагчы дваццаць прэтэндэнтаў. Два мае браты служаць у МНС. І я збіраюся далучыцца да іх пасля таго, як скончу вучобу.

— Было нечакана, што нам паказваюць такія маштабныя вучэнні, — гаворыць **Уладзіслаў АБЛАМЕЙКА, студэнт Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта**. — Я жыву ў Наваполацку, побач з нафтаперапрацоўчым заводам. Самі разумееце, месца патэнцыйна рызыкоўнае. А што да конкурсу, то самыя цяжкія практыкаванні былі па фізічнай частцы, дзе трэба было бегчы, разгортваць шлангі, даставаць манекены. Але мне гэта моцна спадабалася.

Пасля вучэнняў месца дзеяння перамясцілася ў лекцыйную аўдыторыю, дзе і пачалі падводзіць вынікі конкурсу. Студэнт Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта Яраслаў Еўтушэўскі перамог у намінацыі «Найлепшы студэнцкі праект аб бяспецы». Ён прадставіў работу «Зробім ваш дом бяспечным». Асновай для распрацоўкі стаў стары кнопкавы мабільны тэлефон, куды прымацавана ўсяго адна кнопка — SOS. Як кажа Яраслаў, прылада дапаможа людзям з абмежаванымі магчымасцямі выклікаць дапамогу, заадно апавясціўшы родных і сваякоў. Эксперыментальны ўзор прылады пратэсціраваў міністр па надзвычайных сітуацыях.

— У Беларусі створана дакладная сістэма бяспекі, — кажа **міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА**. — Вы ствараеце сабе дадатковую перавагу для выхаду на рынак працы, маеце актыўную грамадзянскую пазіцыю. Бо цяпер спецыяліст мусіць валодаць не толькі комплексам прафесійных ведаў, але і асабістымі якасцямі. Таму мы будзем усяляк падтрымліваць гэты конкурс.

Таксама адбыўся спецыяльны круглы стол, на якім студэнты маглі задаць усе хвалюючыя пытанні высокім гасцям. Навучэнцаў цікавіла многае — і студэнцкая маладосць, і хатнія абавязкі... Асобна была закранута тэма паводак на Палессі.

— Я помню падзеі 1999 года ў вёсцы Астрамечава на Брэстчыне, — кажа **начальнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Канстанцін ШАРШУНОВІЧ**. — У народзе яе называлі «Востраў Куба». Там пражывае больш за тысячу чалавек, якія 18 гадоў таму аказаліся поўнасцю адрэзанымі ад «вялікай зямлі». Нават электрычнасці ў іх не было. Цяпер жа небяспекі такой сур'ёзнай паводкі ўжо не існуе ні для населеных пунктаў, ні для сельгасугоддзяў. Але сказаць, што праблема цалкам сышла ў нябыт, нельга. Дамбы трэба падтрымліваць у належным стане. А ў гэтым шкодзяць бабры...

Акрамя таго, непадалёк ад палігона была ўрачыста адкрыта «Алея студэнтаў».

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.**







# ШУКАЮ ТАННЕЙШЫ ПАКОЙЧЫК

## АДНАПАКАЁЎКІ — 150 ДОЛАРАЎ

Мінімальныя цэны на аднапакаёвыя кватэры ў агенцтвах нерухомасці цяпер пачынаюцца са 150 долараў. Гэта невялікія кватэры з не вельмі сучаснай мэбляй або ўвогуле без мэблі, але з рамонтам. Такія варыянты сёння сустракаюцца не толькі ў новабудоўлях у Фрунзенскім і Заводскім раёнах або Шабанах. Бюджэтныя варыянты з такім цэннікам арэнды невялікіх кватэр магчыма адшукаць амаль ва ўсіх мікрараёнах сталіцы.

Таксама сустракаюцца сёння на рынку часам і ўвогуле танныя варыянты маленькіх кватэр, якія прапануюцца за 140 долараў. Гэта так званыя слабенькія кватэры на крайніх паверхах пяціпавярховых дамоў з мэбляй савецкіх часоў, са старой бытавой тэхнікай або абсталяваныя толькі часткова. Звычайна жыллё такога цэнавога ўзроўню сустракаецца ў старых пяціпавярховых дамах у Чыжоўцы, мікрараёнах Сухарава і Шабаны. Падобных варыянтаў сёння няшмат, але яны ёсць.

Наш эксперт адзначае, што цяпер кліенты падзяліліся на дзве катэгорыі. Першая выбірае выключна танныя кватэры, калі на камфорт жылля (якасная мэбля і свежы рамонт) звяртаецца мінімальная ўвага. А вось сучасны мінскі кватарант з большай цікавасцю разглядае варыянты кватэр цалкам укамплектаваныя нестарой мэбляй, дзе сярод бытавых прыбораў абавязкова прысутнічае пральная машына. Сярэдні цэннік арэнды такіх аднапакаёвак у галоўным горадзе краіны складае 180 долараў. Сярод амаль аднолькавых па якасці і кошце кватэр прыярытэт аддаецца жыллю ў новабудоўлях з развітой інфраструктурай. Аднапакаёвыя кватэры з даволі прымальным рамонтам і з усім наборам сучаснай мэблі і бытавой тэхнікі (абавязкова плоскі тэлевізар і прасторны халадзільнік) прапануюцца сёння за 200 долараў.

## ДВУХПАКАЁЎКІ — АД 180 ДА 220 ДОЛАРАЎ

Бюджэтны варыянт двухпакаёвай кватэры мае мінімальны цэннік, які пачынаецца са 180 долараў за месяц. Па такім кошце прапануюцца кватэры ўвогуле без рамонту або з мінімальным наборам старой мэблі і бытавой тэхнікі. Сярэдні кошт арэнды стандартных двухпакаёвых кватэр, якія карыстаюцца стабільным попытам у кліентаў, складае 220 долараў. Цалкам укамплектаваныя і максімальна падрыхтаваныя для камфортнага жылля двухпакаёўкі, дзе прысутнічаюць усе сучасныя пральныя машыны і часам мікрахвалёўкі, здаюцца ў арэнду сёння за 250 долараў.

Спецыялісты адзначаюць, што мінімальная цана арэнды трохпакаёвых кватэр складае каля 230 долараў. Аднак сёння магчыма адшукаць нават больш танныя варыянты за 200—220 долараў. Звычайна такі цэннік сустракаецца ў старых дамах (без мэблі ці часткова з ёй), у новабудоўлях з кухняй, але без мэблі, а таксама па такім жыллі, дзе нічога не зарэгістраваны. Заўважу, што калі ў кватэры ніхто не «прапісаны», то камунальныя паслугі там аплачваюцца ў максімальным памеры. Сярэдняя цана стандартных па якасці трохпакаёвых кватэр складае 250—260 долараў. Сапраўды якасныя трохпакаёвыя кватэры ў спальных раёнах сталіцы здаюцца цяпер па цане да 280—300 долараў у месяц і нават вышэй.

Даволі сур'ёзным попытам карыстаюцца ў кліентаў сёння і асобныя пакоі ў прыватных кватэрах. Цэны на іх за апошні час таксама істотна знізіліся. Тут цэннік вагаецца ад 50 да 80 «зялёных». Заўважу, што і цяпер уласнікі такога жылля звычайна не рэгіструюць сваіх кватарантаў, каб не плаціць падаткі. Таму пакоі ў большасці выпадкаў прапануюцца знаёмым у прыватным парадку. Пакойчык па такой схеме будзе каштаваць ужо меней — да 50 долараў за месяц плюс пэўная частка аплаты за святло і ваду.

## ЧАКАЦЬ АЖЫЯТАЖУ Ў ЛІПЕНІ-ЖНІЎНІ

Эксперты рынку жыллёвай нерухомасці адзначаюць, што ў апошнія дні мая кліентаў на здымнае жыллё стане крыху больш. Аднак адразу гэты факт ніяк не паўплывае на агульныя тарыфы сталічнай прыватнай арэнды. Справа ў тым, што будучыя кватаранты проста не маюць магчымасці плаціць большыя грошы за арэнду. Апошнім часам заробкі нават у сярэдняга класа работнікаў у доларавым эквіваленце не павялічыліся. Спецыялісты ўпэўнены, што сітуацыя са стаўкай арэнды застанецца стабільнай да сярэдзіны ліпеня. Потым цэны за здымнае жыллё могуць павысіцца.

Змяненне цэннікаў сёлета можа адбыцца толькі пры выкананні некалькіх умоў. Па-першае, свабодных кватэр на рынку стане менш, чым летась. Другім фактарам можа стаць павелічэнне сур'ёзнага попыту не толькі з боку абітурыентаў, а ўжо студэнтаў-першакурснікаў, а таксама маладых спецыялістаў і маладых сем'яў. За ліпень-жнівень сярэднегарадскія стаўкі арэнды могуць падрасці прыкладна на 10—15%. Разам з тым эксперты адзначаюць, што падаражанне здымных кватэр можа ажыццяўляцца і меншымі тэмпамі. Сёння на гэтым рынку не існуе нейкіх сур'ёзных эканамічных прычын, каб цэннік на падобны тавар увогуле рос. Павелічэнне можа мець ажыятажную прычыну, калі кліентам будзе здавацца, што кватэр усім не хопіць. Аднак падобнае падаражанне звычайна мае толькі часовы характар.

## ПРАБЛЕМА «ШЭРЫХ» АГЕНТАЎ

Сёння на рынку прыватнай арэнды жылля існуе праблема, калі паслугі па пошуку варыянтаў кліенту прапануюць спецыялісты-адзіночкі, якія раней працавалі рыэлтарамі ў агенцтвах нерухомасці. У іх ёсць вопыт аналізу рознай спецыялізаванай інфармацыі з розных крыніц. Часам яны завабліваюць кліентаў прывабнымі цэнамі, якія на самай справе не адпавядаюць рэчаіснасці. Калі такі «шэры» агент не паказвае вам спецыяльную картку работніка вядомага вам агенцтва, то спажывец і не мае ніякіх гарантый таго, што атрымае якасную паслугу. Нагадаю, што ў легальным арэндным бізнесе кліенту абавязкова выдаецца дагавор і чэк. Без гэтых дакументаў чалавек увогуле не абаронены ад махлярства.

Наша суразмоўніца паведаміла, што аддзел арэнды агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» прадугледжвае аплату паслугі непасрэдна праз сайт агенцтва і (ці) з выкарыстаннем плацежнай карткі растэрміноўкі «Халва».

Спецыялістамі падлічана, што на другасным рынку арэнды жылля сталіцы доля здзелак па лініі «шэрых» агентаў складае каля 20%.

Нелегальныя прадпрымальнікі ад арэнды часам могуць патрабаваць за свае паслугі значна меншыя грошы, але гарантый яны не даюць увогуле. Цяпер істотна змянілася і само стаўленне ўласнікаў жылля да сваіх патэнцыйных кватарантаў. Калі раней гаспадары свабоднага жылля даволі скрупулёзна выбіралі сабе пастаяльцаў, то сёння іх палітыка наконт гэтага стала больш гнуткай. У гэтым выпадку адсутнасць любога дагавора паміж бакамі можа прывесці да сур'ёзных праблем як гаспадарам жылля, так і кватарантам.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сямейная газета

Выпуск № 9 (76)



# ДВА ЧАРОЎНЫЯ ПАРАСОНЫ

Напачатку года мы з сяброўкай хадзілі ў тэатр беларускай драматургіі на дзіцячы спектакль «Два чароўныя парасоны». Там сустрэлі знаёмага з маленства Оле-Лукойе ў шаўковым кафтане. Пад пахамі ў яго было па парасоне. Адзін, з малюнкамі, які ён раскрывае над добрымі дзеткамі, і тады ім усю ноч сняцца цудоўныя казкі. А другі, чорны, зусім просты, — над дрэннымі. Калі апошнія прачынаюцца ранкам, аказваецца, што яны нічога не бачылі ў сне.

У той жа дзень каля трамвайнага прыпынку назіралі «дажджлівую» сцэну. Дзяўчынка гадоў чатырох плакала наўзрыд. А яе мама, відаць, ад безвыходнасці размахнулася дзіцячым парасонам... Хацела ўдарыць капрызулю, але спынілася і скрозь зубы прамовіла: «Не раві, я сказала. А то зараз дзядзьку цябе аддам!»

«Я раней таксама пастаянна зрывалася на дзяцей, — прызналася Лена. — Павышала голас ледзь не з любой нагоды. Але аднойчы, калі сын у парыве злосці сказаў на мяне дрэннае слова, зразумела, што раблю нешта не так. Псіхатэрапеўт, да якога хаджу, параіла мне перш, чым закрычаць, палічыць да 10. А потым задаць сабе шчыра пытанне: «Чаму я раззлавалася?» І ведаеш, дапамагае, ужо праз колькі секунд крычаць зусім не хочацца».

Калі вярнулася дадому, у інтэрнэце натрапіла на страшнае паведамленне... 15-гадовы хлопец павесіўся дома ў ванным пакоі. Сваякі ўпэўнены, што адна з прычын трагедыі — цкаванне ў новай школе, куды ён перайшоў вучыцца. Па словах бабулі, аднакласнікі дражнілі хлопца за яго прозвішча, знешнасць, брэкеты... Бывала, рэчы выкідвалі ва ўнітаз. «Унук прасіў нас не ўмешвацца. Казаў, «не трэба ісці разбірацца. Мне толькі горш будзе».

Нядаўна знаёмая расказала пра незвычайны адкрыты ўрок, які прайшоў у класе яе дачкі-першакласніцы. Настаўніца паказала вучням два прыгожыя яблыкі. Пасля чаго са словамі «ён мне не падабаецца» кінула адзін з іх на падлогу. І дала дзецям заданне: абразіць «агідны» яблык і пры гэтым укалоць яго танюткай шпількай. Школьнікі ахвотна сталі прыдумваць абразы. «Ты смярдзіш!», «У табе дакладна водзяцца чарвякі!», «Я не разумею, чаму ты наогул існуеш!»... Затым яны павінны былі пахваліць іншы яблык. «Ты самы найлепшы у свеце!», «Твая лупіна выглядае ідэальна!». Настаўніца зноў паказала класу абодва яблыкі: на першы погляд, яны выглядалі так добра, як і раней: вялікія і чырвоныя. Але калі яна разрэзала іх напалам.... Яблык, якому вучні казалі добрыя словы, унутры быў бездакорна свежым і сакавітым. А той, да якога яны былі бязлітасныя, пашкоджаным, мяккім і цёмным. Настаўніца патлумачыла, што тое ж самае адбываецца з дзецьмі, якіх крыўдзяць. Знешне яны могуць падацца звычайнымі, але ўнутры перажываюць страшны боль... Падумалася: вось бы зрабіць такі наглядны занятак ва ўсіх школах. Каб дзеці своечасова зразумелі, што нашы словы нашмат важнейшыя, чым мы думаем.

Адна дзяўчынка, якая выжыла ў Аўшвіцы (Асвенціме), прызналася, што зразумела гэта занадта позна... Яна трапіла ў лагер, калі ёй было 15 гадоў. Яе брату толькі споўнілася 8, бацькоў яны страцілі. «Мы ехалі ў цягніку ў Аўшвіц, — расказвала ўжо пажылая жанчына падчас інтэрв'ю, — я паглядзела ўніз і ўбачыла, што мой брат згубіў чаравікі. І сарвалася на яго: «Чаму ты такі боўдзіла, не можаш нават за сваімі рэчамі ўсачыць!?» Гэта было апошняе, што яна сказала яму ў жыцці. Брат не выжыў... І калі яна выбралася з лагера жывой, дала клятву: «Ніколі не скажу таго, што не магло б застацца маім апошнім словам».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*

■ Ведай нашых!

# «Я папрасіла б у знічкі, каб усе добрыя людзі не хварэлі»

**Дарыя СКАМАРОШЧАНКА, якая ведае на памяць даслоўна больш як 150 дзіцячых кніг, здзіўляе сваёй мудрасцю**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

«Зубная фея якраз перад вашым прыездам прынесла мне ажно два кіндэр-сюрпрызы».

**Завочна я з Дарыяй пазнаёмілася ўжо даўно. Пачалося ўсё з таго, што падпісалася на яе відэаканал на YouTube. І з асалодай слухала, як маленькая брастаўчанка артыстычна чытае на памяць свае любімыя дзіцячыя кніжкі. *(Чытаць Дарыя навучылася ў два гады, а літары вывучыла яшчэ раней. — Аўт.).* Менавіта сваёй неверагоднай памяццю дзяўчынка і пакарыла Максіма Галкіна на шоу «Лепш за ўсіх». А зусім нядаўна Дарыя з мамай Кацярынай Таберка вярнулася дадому з Масквы, дзе здымалася ў перадачы пра дзяцей з унікальнымі здольнасцямі «Золата нацыі». Мы з фатографам завіталі ў госці да маленькай зорачкі, якая не любіць хваліцца, бо лічыць, што «дзяўчынку ўпрыгожваюць не толькі сукенкі, але і сціпласць».**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

■ Смачная экскурсія

# ПЛАМБІР У ТРОХЛІТРОВЫХ СЛОІКАХ

## Музей, дзе можна есці і залазіць на экспанаты

**Дзе і калі прыдумалі марожанае? Як выглядаў самы вялікі вафельны ражок у свеце? Колькі каштуе халодны дэсерт для гурманаў з ядомым золатам? Пра ўсё гэта можна даведацца ў першым у краіне музеі марожанага «Белы полюс», які нядаўна адкрыўся ў Мінску.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*



Фота Надзеі БУЖАН.

У музеі створана каля 20 вясёлых фотазон.

■ Насуперак стэрэатыпам

# Калі бег акрыляе

## Як бацькі асаблівых дзетак вяртаюцца да жыцця



**Ідзе трэніроўка незвычайнай інклюзіўнай спартыўнай каманды. Дзеці бягуць разам з дарослымі. Хто з мамай за ручку, хто верхам на тату, а каго вязуць у калясцы. Прыгожыя, шчаслівыя, моцныя. Хацелася ўзляцець разам з імі. Пакуль вялікая колькасць людзей сядзіць па сваіх дамах і стогне, як сумна і цяжка, «Крылы анёлаў» бягуць насустрач яскравым эмоцыям. Калі ведаеш, з якіх праблем ім удалося ўзняцца, адчуваеш, што назіраеш за цудам.**

### Вяртанне

Раней дзеці з цяжкай інваліднасцю праводзілі час у чатырох сценах, у лепшым выпадку можна было выбрацца на нейкія спецыялізаваныя мерапрыемствы для людзей з такімі ж праблемамі. А разам з малымі «выпадалі» з жыцця і іх бацькі. Сёння «анёлы» — дзеці з інклюзіўнай каманды і «крылы» — дарослыя, якія дапамагаюць ім прымацць удзел у розных спартыўных трэніроўках і прабегах, — на вачах. Вяртанне цэлых сем'яў стала магчымым пасля маленькай рэвалюцыі ў свядомасці... А пачалося ўсё з дзёрзкага забегу Дзмітрыя Цімашкова і яго дачушкі Лілі (якую ён каціў у спецыяльнай калясцы) на Мінскім паўмарафоне («Звязда» ад 15.10.2015 года). Аказалася, спорт здымае межы. Людзі навокал не адводзяць позіркі ад спартсменаў з інваліднасцю, а наадварот, вітаюць такіх марафонцаў больш натхнёна, чым астатніх. Гэта сапраўды акрыляе. Можа таму ініцыятыву Дзмітрыя хутка падхапілі іншыя. І цяпер у камандзе «Крылы анёлаў» дзясяткі, а мо і сотні бегуноў. У спецыяльнай суполцы ў інтэрнэце іх падтрымліваюць спартсмены-аматары з усяго свету. А зусім нядаўна Дзіма і Ліля беглі марафон у Севільі. 42 кіламетры! Як бачыце, нават дзеткам з цяжкай інваліднасцю ёсць месца ў спорце.

— Буйныя спартыўныя спаборніцтвы — вельмі добрая мэта, якая дазваляе мабілізавацца і на тое, каб развіваць свае спартыўныя дасягненні, і на догляд за дзіцем, — заўважае Дзмітрый Цімашкоў. — Маленькі партнёр павінен быць гатовым да таго, што ў пэўны дзень і час будзе бегчы ў пары з табой чатыры гадзіны. У Іспаніі мы адчулі, што марафон — гэта не толькі спартыўная пляцоўка, але і магчымасць для прасоўвання любых інтарэсаў — сацыяльных, асабістых. У прыватнасці, там мы пазнаёміліся з арганізацыяй, якая збірала грошы на навуковыя даследаванні, каб дапамагчы дзецям з цяжкай рэдкай хваробай.

Вельмі важна данесці да беларусаў, што марафоны — для ўсіх, а не толькі для спартсменаў.

— Я ж не бегаў усё сваё жыццё, а пачаў гэтым займацца ў 49 гадоў, — прызнаецца Дзмітрый. — Калі выходзіў на першыя прабежкі, надзяваў чорныя акуляры: было сорамна сутыкацца з мінакамі вачыма, я разумеў, што выпраўка ў мяне нееспартыўная, што бегаю дрэнна, дыхаю цяжка, ад ветру слёзы з вачэй коцяцца. Прайшло.

Услед за сталічнай інклюзіўнай камандай бегаць з асаблівымі дзеткамі пачалі бацькі ў Віцебску, а ў хуткім часе «Крылы анёлаў» хочуць далучыць да гэтага руху людзей з іншых рэгіёнаў.

Звычайна чалавек камплексуе займацца бегам побач са спартсменам — гэта як недасягальная вышыня. А тут камфортна ўсім. Ужо далучылася шмат людзей, якія гатовы паспрабаваць сябе ў ролі «крыла». Летам аматары бегаюць у парках, узімку купаюцца ў палонцы, рэгулярна трэніруюцца ў зале. З'яўляюцца агульныя інтарэсы, сяброўства, жывыя зносіны. Прычым знаходзіцца багата розных тэм для абмеркавання, дзе аб праблемах, звязаных з інваліднасцю, лячэннем, імкнуцца не ўспамінаць. «Гэта дазваляе расслабіцца, ажыць духам, — прызнаецца Дзмітрый. — Нават, калі ў сям'і праблема з дзіцём, гэта не павінна быць адзіным інтарэсам у жыцці, інакш можна звар'яцець».

### Рэабілітацыя

Спорт разбурае стэрэатыпы. У людзей, якія раней не сутыкаліся з інвалідамі, тут не ўзнікае такіх эмоцый, як разгубленасць і шкадаванне. Узаемадзеянне пачынаецца на пазітыўнай хвалі. Тут «ажываюць» усе члены сям'і, дзе ёсць дзіця са складаным дыягназам. Здаровыя брацікі і сястрычкі перастаюць камплексаваць, што ў іх сям'і нешта не так. А ў бацькоў з'яўляюцца новыя мэты.

— Я сам, будучы бацькам дзіцяці з інваліднасцю, доўгія гады баяўся паказацца з ім на вуліцы, — прызнаецца тата Лілі. — Саромеўся, што ўсе ездзяць з прыгожымі звычайнымі калясками, а ў мяне — не такая. Як быццам дзіця з інваліднасцю крыху прыніжае ваш статус як бацькоў, бо не можаш (як гэта робяць іншыя) праз яго дасягнуць нейкіх вышынь, якіх не дабіўся сам. Спорт мяняе адносіны да дзіцяці, яны ператвараюцца ў партнёрскія: малы павінен змагчы, як і ты. З'яўляецца планка, якую падымаеш усё вышэй. Мы ж не думалі год назад, што будзем бегаць міжнародныя марафоны, што атрымаем прызнанне сярод спартыўных арганізацый. Цяпер беларуская федэрацыя лёгкай атлетыкі запрашае нас на марафоны.

Ліля — як іншыя дзеці каманды — сапраўды той анёл, які нясе надзею іншым сем'ям. Гэтыя малыя зрабілі больш моцнымі сваіх бацькоў: многія дарослыя прызнаюцца, што маглі б і не прыйсці да спорту, каб не дзеці.

— Усе кажуць, што ДЦП — гэта шэра. Я дзяліўся праблемай: дзіця не спіць і я з ім, і так пяць гадоў, я больш не магу. І доктар з высокім статусам кажа: «На жаль, такія дзеці дрэнна спяць». І думка далей не ідзе. А што з гэтым рабіць? Так, усё дрэнна, але як з гэтым жыць? А пасля я заўважыў цікавую рэч: інваліднасць — не хвароба. Часта кажуць: «людзі пакутуюць з ДЦП ці аўтызмам». Яны жывуць звычайным жыццём. Пакутуем у асноўным мы — тыя хто іх даглядае, бацькі. Гэта праблема сям'і і соцыуму. Спорт, якім мы займаемся, дазваляе зрабіць дзіця здаровым. У мяне картка першых пяці гадоў жыцця дачкі таўшчынёй у далонь. Гэта пастаянныя прастуды, тэмпература 40, бальніцы і інш. Усё закончылася. Апошні раз з прастудай звярталіся ў паліклініку год назад. Дзіця з інваліднасцю можа быць здаровым і жыць паўнацэнным жыццём. Уключэнне ў соцыум мае вялікае значэнне для стану малога. Ён бачыць навокал многа нова, і ў яго з'яўляюцца жаданні, якія б ніколі не ўзніклі, калі б ён сядзеў дома. Я гэта заўважыў па дачцэ: раней яна была пасіўным дзіцем, ніколі не зразумела было, калі яна можа закрычаць ці захоча спаць. У выніку трэніровак з'яўляюцца дадатковыя сэнсарныя магчымасці. Калі раней дзіця «блукала» позіркам, зараз ён асэнсаваны. Спартыўны лад жыцця рэгулюе рэжым дня, тыдня. Так, мы ведаем, што па аўторках і чацвяргах яна павінна на іх быць. Ёй падабаецца рабіць практыкаванні з усімі, а дома гэта было без усялякай ахвоты. У выніку дачка пачала стаяць. Восенню ў паліклініцы праходзілі чарговы медагляд, неўролаг была ўражана, маўляў, звычайна пры такім захворванні дзіця так не развіваецца. Нам знялі частку асноўнага дыягназу. Урачы, з якімі сутыкаюся, вопыт бачаць, здзіўляюцца некаторым рэчам, але гэта застаецца паміж мной і імі. Добра, каб гэта пераходзіла ў медыцынскія пратаколы. Так, некалькі гадоў таму мне казалі: што б я ні рабіў, дасягну нейкага мізеру. А я бачу, што дзіця становіцца ўсё лепшае, здаравейшае і здольнае на нейкія самастойныя рэчы. Нельга гэта ігнараваць. Медыцына павінна такія рэчы падхопліваць. Хацелася б, каб былі нейкія даследаванні. На прыкладзе нашых дзяцей гэта можна вывучаць...

Толькі скончылася трэніроўка, узмакрэлыя, стомленыя «Крылы анёлаў» не спяшаюцца разысціся. Хтосьці расцягнуўся на матах, дзятва распачала гульню з мячом, дарослыя абмяркоўваюць апошнія навіны. Усмешкі не сыходзяць з твараў. Вось яно — рэальнае жыццё. Так проста! Паспрабуем?

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
*dziadziula@zviazda.by*

■

# ПЛАМБІР У ТРОХЛІТРОВЫХ СЛОІКАХ



На ўваходзе кожны наведвальнік атрымлівае пачак халоднага ласунку.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

На плошчы, роўнай чатыром тэнісным кортам, змясціліся розныя экспанаты і атракцыёны.

— Музеі такога фармату ёсць у многіх буйных гарадах свету — ад Нью-Ёрка да Дубліна. Літаральна на днях ён з'явіўся і ў Лос-Анджэлесе. Мы натхняліся замежным вопытам, але пастараліся не страціць і нашу нацыянальную адметнасць, — расказвае куратар музея Вольга Цішкевіч. — Гэта інтэрактыўная прастора, а таму экспанаты рукамі чапаць можна! А яшчэ рабіць з імі сэлфі і, нават, залазіць на іх вярхом.

Наведвальнікі змогуць аказацца на віртуальнай фабрыцы на вырабе марожанага і ўбачыць, як стварaецца любімы прысмак (вы ведалі, што гэты працэс займае каля 20 дзён?). І, вядома, прадэгуставаць. Спецыяльна для работы музея прыгатавана больш за 10 тысяч тон пламбіру, каб ніхто не застаўся без дэсерту.

### ЦІ ЧУЛІ?

У старажытнай Грэцыі марожанае лічылі карысным для здароўя. Заснавальнік сучаснай медыцыны Гіпакрат рэкамендаваў есці лёд сваім пацыентам, каб загартоўваць горла.

На тэрыторыі Беларусі марожанае з'явілася ў часы Вялікага Княства Літоўскага дзякуючы княгіні Боне Сфорца. Рэцэпт быў просты: змяшаць літр малака, пяць яечных жаўткоў, адзін бялок і шклянку цукру. Але дэсерт у тую пару быў даступны толькі шляхетным асобам.

Асобны стэнд расказвае пра марожанае ў СССР. Вось дзе будзе цікава не толькі дзецям, але і бацькам, якія змогуць панастальгіраваць па тым самым смаку. Яго, дарэчы, упадабалі і турысты: тады казалі, што ў саюз варта прыехаць з трох прычын — паглядзець балет, схадзіць у цырк і пакаштаваць марожанае. За мяжой савецкі ласунак каштаваў вельмі дорага, бо лічыўся самым натуральным і якасным.

Першая партыя «халоднага прадукту» ў СССР была выпушчана чацвёртага лістапада 1937 года. Сучасным школьнікам будзе ў навіну, але тады ў кіёсках гэты прысмак бываў нячаста, у лепшым выпадку тры разы на тыдзень. Таму па дэфіцытны прадукт выстройваліся даўжэзныя чэргі. А калі марожанае прывозілі ў вёскі — гэта было сапраўдным святам. Людзі набывалі пламбір трохлітровымі слоікамі! На думку наркама, савецкі грамадзянін мусіў з'ядаць не менш за пяць кілаграмаў марожанага на год (гэта амаль у два разы больш, чым з'ядае за год сённяшні сярэднестатыстычны беларус).

Цікава, што звыклы для нас вафельны кубачак з'явіўся параўнальна нядаўна — стагоддзе таму. Месцам сустрэчы ражка і шарыка марожанага стаў сусветны кірмаш у амерыканскім горадзе Сэнт-Луісе. Гэта было ўвесну 1904 года, і пламбір на тым кірмашы карыстаўся такім попытам, што пластыкавыя кубачкі для яго хутка скончыліся, і людзі чакалі ў чарзе, калі памыюць наступную партыю. Побач з прадаўцом марожанага Арнольдам Фомачу гарачымі вафлямі гандляваў Эрнэст Хамві. Ажыятажу на апошні прадукт у той спякотны дзень не назіралася, і Эрнэсту прыйшла ў галаву геніяльная ідэя. Ён скруціў адну вафлю ў конус і перадаў Арнольду, каб той апусціў туды шарык марожанага. З тых часоў ласунак стаў прадавацца ў новым варыянце.

А яшчэ ў музеі, акрамя знаёмства з гісторыяй, можна пабываць у гаі з эскімо, пасядзець у копіі кавярні-марожанага, якая была адкрыта ў Парыжы ў 1860 годзе, і ўбачыць самы вялікі пламбір у свеце. Па словах арганізатараў, прастора стане месцам не толькі для экскурсій, але і для майстар-класаў і адукацыйных лекцый.

**Дзе:** пр. Пераможцаў, 9, гандлёвы цэнтр «Galleria Minsk», 6 паверх.

**Калі:** штодзень з 10.00 да 22.00, па 31 ліпеня.

Кошт квіткоў: 5 рублёў для дарослых, 3 рублі для дзяцей. У гэты кошт уваходзіць і марожанае, якое наведвальнікі будуць атрымліваць на ўваходзе.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■



Фота Надзеі БУЖАН.

Вось так гатуецца нанамарожанае!

# ПРЫГОДЫ Ў ПРЫЛУКАХ,

## месцы, маляўнічым настолькі, што просіцца ў настолкі

**Падарожжа толькі тады ўдалае, калі яно быццам выхад за межы рэальнасці. Напісала так — і задумалася: ці не звышчаста ўжываная фраза? Добра, перапішу: кожнае ўдалае падарожжа перакульвае рэальнасць з ног на галаву — з тым, каб нешта ў ёй памяняць.**



Я і падумаць не магла, што мае ўяўленні падчас чытання аповедаў пра панскія маёнткі настолькі супадаюць з тым, што я ўбачу аднойчы наяве, а менавіта — падчас вандроўкі, пра якую размова. І вось на ўласныя вочы — тое, што бачыла ўнутраным зрокам. На крутым узгорку — палац у меру мудрагелістай архітэктуры, а на аддаленні ад яго, быццам на нечай гіганцкай далоні, — у меру ўрачыстыя каменныя пабудовы: свіран, вінакурня, дом аканома... Усё гэта разам, калі глядзець трошкі зверху (ландшафт тут шматузроўневы, і так бачыць дазваляе), нагадвае... гульню-настолку.

Між іншым, нічога не замінае яе стварыць, варта толькі знайсціся ў меру прадпрымальнаму аматару гісторыі і падарожжаў, ды авантурнаму мастаку яму ў паплечнікі, ды актыўных «краўдфандзераў» у кампаньёны. Паміж пагоркам з палацам і мураванымі пабудовамі, што рассыпаліся ўнізе, на ўяўнай далоні, трэба будзе намаляваць ясна-блакітнае возера. Формай яно павінна нагадваць цень белага мядзведзя, які сядзіць на задніх лапах, узняўшы пярэднія. Але назва ў возера павінна быць зусім не беламядзведжай, а нават наадварот: вытворца гульні-настолкі павінен вырабіць указальнік з надпісам «Чорнае возера». Як будзе называцца настолка? «Прыгоды ў Прылуках».

Гульня можа мець некалькі ўзроўняў, у адпаведнасці з якімі антураж мусіцьме паступова мяняцца. Пачаўшы ад XVII стагоддзя (узровень «Абіцель», для антуражу спатрэбяцца фігуркі заснавальніцы праваслаўнага манастыра Ганны Стэцкевіч і мітрапаліта Пятра Магілы), іграюць будуць, мяняючы этапы, рабіць на паперы гісторыі крокі памерамі ў дзесяцігоддзі. Пераход на новы ўзровень («Замак») дазволіць выняць са скрыні фігуркі прывіду і паэта Антонія Эдварда Адынца. Наступны ўзровень («Сядзіба») запатрабуе з'яўлення на папяровым ландшафце фігурак Магдалены Іваноўскай з Прушынскіх, Францішка Оштарпа, Атона Горвата... Хоць апошні — гэта ўжо новы ўзровень: «Палац». Са скрыні іграюць дастануць новыя прадметы — будынкі стайні, аранжарэі, афіцыны, фігуркі коней і дрэўцаў для пейзажнага парку...



Малюнак Напалеона Орды.

*Паслядоўнікам*

**У мясцовай царкве Раства Прасвятой Багародзіцы выпякаюцца і распісваюцца незвычайныя пернікі. Старая ж царква, якая была некалі перабудавана ў сельскі клуб, мае такую незвычайную і вялікую гісторыю, што апісаць яе тут немагчыма, таму адсылаю чытача-паслядоўніка да адпаведных крыніц на праваслаўных парталах. Падарожжы яшчэ і тым цікавыя і карысныя, што з імі пашыраюцца граніцы ведаў.**

Я, прабачце, вельмі захапілася.Нават не паведаміла, куды нас даставіў бясстрасны голас навігатара. Хоць сякія-такія падказкі чытач ужо мае. Пранікліві і гістарычна падкаваны ўжо мо і здагадаўся: мы ў Прылуках, на тэрыторыі сядзібы, апошнімі ўладальнікамі якой, з 1872 года, былі графы Чапскія — Эмерык і яго сын Юрый. У гісторыі гэтага месца (да якога ад Мінска з паўдняваа яго боку не больш як дзясятак кіламетраў) ёсць вельмі цікавыя акалічнасці. Найперш, манастырскае паходжанне, па якім абіцель была літаральна ператворана ў замак. Ці, як кажуць некаторыя ўражаныя даследчыкі, замак яе, абіцель тую, літаральна паглынуў. І быццам не без ахвяры: у замку з'явіўся прывід.

Не ведаю чаму, але аглядаючы сцены палаца Чапскіх (будзем яго ўжо так называць), міжволі разважаеш, якія элементы ад замка і манастыра засталіся — так і хочацца бачыць у адной пабудове ўсе тры. Між іншым, рэч «тры ў адным» (у сэнсе — адну на ўсе тры перыяды) знайсці тут лягчэй лёгкага. Проста глядзець трэба не на сцены, а на тое, што пад сценамі. Як ні хочацца мне прытрымаць інтрыгу, але напішу: зірніце на ўзгорак, літаральна на вал, замкавы і манастырскі. З тыльнага боку да палаца яшчэ трэба здолець ускараскацца. Іншымі словамі, прыгоды тут забяспечаны, з XVI стагоддзя да нашых дзён!

Яшчэ адна цікавая акалічнасць і яшчэ адно міжвольнае жаданне бачыць нябачнае: справа ад палаца стаяла некалі чатырох'ярусная вежа з гадзіннікам. Дах аднаго з ярусаў служыў тэрасай. Той ярус, які меў гадзіннік, акружала галерэйка. А ярус, які размяшчаўся пад зямлёю, выконваў ролю лядоўні. Гэткая прыдумка сумясціць прыгожае з практычным. І яшчэ адно нябачнае сярод бачанага: у дрэвах, што растуць паўсюль навокал, ва ўсім гэтым даўно беззваротна змененым парку праглядаецца такая невераглодная маляўнічасць... Яе не зблытаеш з відарысам прыроднай пасадкі. Прынамсі, кружляючы каля палаца, я ўспамінала дзяцінства — той час, калі і маё жытло межавала быццам са звычайным паркам, а на самай справе, як пасля я даведалася, уяўляла сабою сляды парку іншага кшталту — старога сядзібнага, што належаў не абы каму, а Наркевічам-Ёдкам. Ці не тады, яшчэ мо неўсвядомлена, я захварэла гісторыяй і падарожжамі? Вось вам яшчэ адна выснова ў тэме змены поглядаў на рэальнасць: нельга нішчыць старыя месцы — сядзібы, капліцкі, паркі, бровары і млыны, — бо ў іх пануе дух захапляльнай для некага будучыні. Хто ведае, што гэты нехта сваім на першы погляд простым захапленнем здолее перайначыць?..

А сядзіба ў Прылуках, між тым чакае новых вандроўнікаў. Мы ўбачылі ў ёй ідэю для стварэння гістарычнай настольнай гульні. А што ўбачыце вы?

**Падарожнічала Святлана ВОЦІНАВА.**

*Рамантыкам*

**Кажуць яшчэ (і пішуць), што гісторыю аб'яўлення ў замку прывіду апісаў у паэтычнай форме Антоні Эдвард Адынец. Твор быццам так і названы — «Зачараваны замак». Але хто чытаў гэты твор? Існуе яшчэ адзін «Зачараваны замак», пра які, прынамсі, вядома больш. Опера «Зачараваны замак» (ці «Страшны двор») створана Станіславам Манюшкам паводле зусім іншых тэкстаў. Ды і прататыпам паслужыў не Прылуцкі замак, а Смілавіцкі, маёнтак Манюшкаў. Цікава, што Станіслаў Манюшка ў Прылукі наведваўся. З бацькам. Але на вершы Адынца напісаў зусім іншую музыку. А што Антоні Эдвард Адынец? Памятаю, яго «Лісты з дарогі», заяўленыя як успаміны, былі названы містыфікацыяй, прычым, не адным даследчыкам, а адразу некалькімі. Фантазёрам быў наш Адынец, вось кім. Яго тэксты, падаваныя як даследаванні, рэкамендавалася выкрасліць з навуковых інвентароў і перанесці ў шэраг дзей паэтычных. Але добрага паэта і патрыёта ў ім такія акалічнасці не знішчаюць. Зноў жа пра погляды на рэальнасць: нідзе не трэба бачыць ідэалы — трэба бачыць паўсюль людзей, якімі яны ёсць, сапраўднымі, а не героямі нечага часу. Што да прывіду... Няхай жыве, не пашкодзіць.**



Справа ад палаца стаяла некалі чатырох'ярусная вежа з гадзіннікам.

### ДАЛЁКА І БЛІЗКА

13 мая ў Нідэрландах адзначаецца Дзень веласіпедыста. Ровар для жыхара гэтай краіны не сродак перасоўвання, а... проста сябар. Бо не казаць жа, што гэта і дом, і цэлы свет. Хоць менавіта так і выглядае. Жыхар Нідэрландаў можа, не злазячы з ровара, і есці, і чытаць, і знаёміцца, і заляцацца. І ровары там пераважна старыя, не «мадэрновыя». Тым цікавей наведаць Нідэрланды ў гэты дзень.



**20—21 мая ў парку гісторыі «Сула», што пад Рубяжэвічамі, ладзіцца ваенна-гістарычная рэканструкцыя «Бітва чатырох эпох». Чацвёрку эпох прадстаўляюць вікінгі, рыцары ВКЛ, шляхта і беларуская ўланы часоў вайны з Напалеонам. Усе яны разаб'юць лагеры, што само па сабе відовішчна, і возьмуцца інсцэніраваць кожны сваё — круг Одзіна, штурм гарадзішча, розныя баталіі і іншае.**



20 мая ў аграгарадку Гальшаны каля тутэйшага замка пройдзе аднайменнае яму мерапрыемства. Фестываль «Гальшанскі замак» ладзіцца ў гонар 595-годдзя з часу ўступлення ў шлюб Соф'і Гальшанскай. Наведвальнікаў чакаюць шматлікія дзеі, з якіх бадай самыя незвычайныя (прынамсі, паводле гучання) інтэрактыўны спектакль вандроўнага тэатра, майстар-клас па хадзьбе на старадаўніх хадулях і начны штурм крэпасці.

**27 мая ў Германіі, у Оберкірху — Свята клубніцаў. Мо і ранавата — клубніцы ў маі, але калі абяцаюцца ласункі і далікатэсы, то... То якая нам розніца? Збірайм ся ў Оберкірх!**



30 мая ў Кітаі пройдзе традыцыйнае для гэтага часу свята па формуле «два ў адным». Гэта і Дзень паэта, і свята падвойнай пяцёркі — бо адзначаецца ў пяты дзень пятага месяца па месячным календары. У гэты дзень ладзіцца на рацэ гонкі чаўноў-цмокаў. Павінна быць цікава.



**1—2 ліпеня ў Вілейцы — «Гонару продкаў — 2017», трэці па ліку, а значыць, ужо традыцыйны. Фэст прысвячаецца грамадзянскай вайне 1432—1438 гадоў. Гэта гісторыя не пра тое, як змагаліся з ворагамі-прыхаднямі, а пра тое, як ваявалі свае са сваімі, землякі між сабой. Як такое можна адлюстраваць у фэсце? Трэба пабачыць.**

# «...каб усе добрыя людзі не хварэлі»



«Няважна, якую ўзнагароду дадуць.
Мне падабаецца гуляць і вучыцца ў іншых».

## Пра Сару Кру, торт па шведскім рэцэпце і «вада камень точыць»

**— Дарыя, ты згодная, што кніга — гэта найлепшы падарунак?**

— Так. Ці хадзілка па якой-небудзь кнізе.

**— А што такое хадзілка па кнізе?**

— *(Дастае з паліцы).* Ёсць такая кніга пра Пэтсана і Фіндуса. Мама зрабіла па яе сюжэце хадзілку. Кідаеш кубік, ходзіш фішкамі і выконваеш розныя цікавыя заданні.

**— Летась бацькі зрабілі табе незвычайны падарунак: квэст па матывах любімай кніжкі «Чараўнік Ізумруднага горада». Нядаўна табе споўнілася шэсць. Як на гэты раз святкавала дзень народзінаў?**

— Не па кнізе, бо былі ў Маскве. Мяне прыйшлі павіншаваць новыя сябры — удзельнікі праекта «Золата нацыі». Мама замовіла вялізны торт. Ён быў вельмі смачны, па шведскім рэцэпце.

— Пасля вяртання дзядуля з бабуляй падарылі Дарыі набор мастака, — дадае мама Дарыі, якая калекцыянуе якасныя дзіцячыя кнігі і вядзе свой блог «Кніжны шкап». — Мы з мужам — настольную гульню і кніжку. Стараемся не дарыць шмат падарункаў, каб яны мелі нейкую каштоўнасць. Зараз у нас *(азіраецца па баках)*, лічу, зашмат рэчаў. Вясной і зімой перад Раством з Дарыяй і Данікам разбіраем цацкі і адносім тыя, якія ім не шкада, у прытулак, іншым дзеткам.

— Я не ведаю, што такое голад і холад. Але мне здаецца, што пасля таго, як я пазнаёмілася з Сарай Кру, дык зразумела, што гэта такое...

**Кацярына:** — Сара Кру — гэта новая любімая гераіня Дарыі, з кнігі «Маленькая прынцэса».

**— З задавальненнем паглядзела перадачу «Золата нацыі». І вельмі радавалася, калі ты прынесла перамогу сваёй камандзе: спачатку ўгадала слова «тачылка», а потым і «цыркуль». Як так атрымалася? Можа, таму што мама архітэктар і ты гэтыя прадметы бачыла не раз?**

**Кацярына:** — Гэта нешта неверагоднае! Але за дзень да запісу праграмы мы з Дарыяй былі на прадстаўленні ў цырку Нікуліна. І я ёй расказвала, што слова «цырк» паходзіць ад лацінскага «цыркус» — круг. Таму што арэна круглая. І што слова «цыркуль» таксама звязана са словам «круг», бо пры дапамозе гэтага інструмента можна яго начарціць.

— А «тачылку» адгадала, таму што ў кніжцы яшчэ даўно чытала прыказку «вада камень точыць».

**— Звярнула ўвагу, што практычна ўсе дзеці з каманды, якая прайграла, плакалі. А ты там так цудоўна сказала: *«Усе дзеці малайцы! І я іх абдыму. Я не хачу, каб яны засмучаліся».***

**Кацярына:** — Яна іх усіх потым абняла.

**— Дарыя, а ты калі-небудзь засмучаешся?**

— Я не засмучаюся, калі мне не вельмі моцна балюча.

**Кацярына:** — Калі яна ўпадзе і ўдарыцца, яна крыху засмуціцца.

**— Каця, як зрабіць так, каб дзіця не засмучалася?**

— Проста не трэба ператвараць перамогу ў нейкую каштоўнасць. Ніяк не абазначаць гэта. Там быў хлопчык, якога бацькі настроілі: «Ты абавязаны выйграць, мы не можам паехаць назад без перамогі». Дзеці засмучаюцца не таму, што яны прайгралі, а таму, што засмучаюцца іх бацькі. Незалежна ад таго, перамагла Дарыя ці не, я ўсё роўна рада за яе.

## Пра 50 тысяч грывен, шахматнага каня і вудачку для таты

*Дарыя дастала з паліцы шахматы.*

— А вы хочаце са мной у шахматы згуляць?

— Я хачу, — падбягае трохгадовы брацік Даніла.

— Данік, табе белыя ці чорныя?

**— Дарыя, хто цябе захапіў шахматамі?**

— Мой сябар Арцём хадзіў на шахматы. Ён неяк паказаў, як ходзяць фігуры, і так зачараваў мяне, што я папрасіла маму з татам запісаць і мяне ў гурток.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Самы вялікі скарб у гэтай творчай сям'і — вялізная шафа з кнігамі.
І нават дзеці абыходзяцца з імі надзвычай акуратна.

**— Бачыла ў тваім Instagram (яго вядзе мама Дарыі. — Аўт.), што ты нядаўна заняла першае месца ў чэмпіянаце краіны па шахматах.**

— Я гуляла з дзеткамі майго ўзросту. І выйграла шэсць партый з шасці. Цяпер рыхтуюся да чэмпіянату свету. Трэніруюся дома з дзядулем. Ён лепш за ўсіх у нашай сям'і гуляе.

**Кацярына:** — Гэтыя шахматы — дамашнія, яшчэ з майго дзяцінства. У нас ёсць і дарожны набор. Мы яго бяром заўсёды з сабой. І на «Золата нацыі» бралі. Там, дарэчы, усе дзеткі ўмелі гуляць у шахматы.

— Пакуль ехалі, я ў цягніку гуляла з мамай. І з дзядзем, які насупраць сядзеў. Гэта гульня вельмі цікавая. Яна не проста захапляльная тым, што тут ёсць шмат фігур. А яшчэ і тым, што кожная фігура ходзіць неяк па-свойму. А для хлопчыкаў гэта яшчэ як сапраўдны бой. Вось, напрыклад, для Даніка. Пешкі бягуць, коні скачуць, ладдзі плывуць!.. *(вельмі эмацыянальна размахвае рукамі)*.

**— Якая ўзнагарода для цябе больш важная: медаль на чэмпіянаце па шахматах ці 50 тысяч грывен, якія ты выйграла ў токшоу «Рассмяшы коміка» сваімі жартамі?**

— Няважна, якую ўзнагароду дадуць. Мне падабаецца гуляць і вучыцца ў іншых.

**— Спачатку ты рассмяшыла комікаў. А пасля пакарыла ўсіх тэлегледачоў тым, як вырашыла распарадзіцца выйгрышам: *«Я патрачу грошы: маме — на завушніцы і сукенку, тату — на вудачку, сабе — на кніжку, брацiку — на сапраўдны шчыт, дзядулю — на інструменты для агарода, бабулі — на насенне для кветак. А яшчэ, калі што-небудзь застанецца, нам усім на кніжную краму».* Якой павінна быць гэтая крама ў тваім уяўленні?**

— Там замест сцен будуць драўляныя кніжныя палічкі. На іх мы паставім усе самыя лепшыя кніжачкі. У нас дома іх больш за 4 тысячы. І туды будуць прыходзіць дзеткі і браць любыя з іх. А яшчэ там будуць жыць трусік Містар Тумі і папугай Бо. Іх можна будзе забраць з сабой дадому на выхадныя пагасціць. А каля ўвахода будзе стаяць парасон Оле-Лукойе, які можна ўзяць з сабой, калі раптам пайшоў дождж.

**Кацярына:** — Гэта будзе чароўнае месца, дзе прадаўцы любяць дзяцей і добрыя кнігі больш за ўсё на свеце і кожны дзень носяць новы дзіўны капялюш. А яшчэ ў нашай краме будуць дні казак, прагляд дыяфільмаў, тэатр ценяў...

## Пра геніяльнага дырэктара, перламутравы цвік і сярэдзіну сасіскі

*Данік ускараскаўся на зэдлік і пачаў чытаць спачатку літары, а затым словы цалкам, напісаныя на спецыяльнай дошцы на кухні: «П, і, р,о,г, пірог...»*

**— Дарыя, гэта ты яго навучыла чытаць?**

— Не, не я. Тата. Бачыце, там машынка намаляваная, калі ён назаве ўсе словы, то загоніць яе ў гараж.

**— Можа, таму, што Уладзімір апошнім часам больш за ўсё з Данікам часу праводзіць?**

**Кацярына:** — Данік ведаў усе літары. Перад нашым ад'ездам на «Золата нацыі» яны з татам атрымалі баявое заданне: вывучыць лічбы да 10 і навучыцца чытаць. Мы вярнуліся праз месяц, праверылі: усё ведае, усё чытае.

**— Дарыя, ты сумавала па тату з брацікам?**

— Пастаянна думала: што нашы хлопцы там дома робяць? Я адкладу гэтыя дзве гульні. І мы пасля з вамі пагуляем, калі пагаворым. Добра?

**— Ты, напэўна больш за ўсё на свеце любіш гуляць?**

— Не, больш за ўсё на свеце я люблю маму. Яна мая найлепшая сяброўка *(абдымае Кацю).*

**— А што для цябе значыць найлепшая сяброўка?**

— Гэта калі ты з ёй усім дзелішся, усё расказваеш. Я лічу, што яе трэба заўсёды слухацца і не адмаўляць ёй. І яшчэ трэба яе ўвесь час абдымаць і любіць.

**— А што трэба рабіць маме, каб яна стала найлепшай сяброўкай для дачкі?**

— Напэўна, таксама яе любіць. Тады ўсё атрымаецца.

**— Дарыя, як ты ўмудрылася запомніць столькі кніжак?**

— Напэўна, таму што я дома шмат-шмат разоў чытала гэтыя кнігі. Яны былі мне знаёмыя, як сябры. Хочаце, я вам раскажу, як я магу вывучыць любую кніжку на памяць? Прачытала, лягла на яе жыватом, каб не падглядаць. І расказваю тое, што памятаю. А калі нешта забылася, то не падглядаю. А расказваю далей тое, што памятаю. А пасля зноў перачытваю спачатку і зноў кладуся жыватом.

**Кацярына:** — Я раней чытала ёй услых, і яна запамінала. А цяпер Дарыя сама хутка чытае. Нядаўна ёй давералі весці ў Брэсце вялікі фестываль. Я ёй раздрукавала словы, якія трэба было вывучыць, а сама займаюся сваімі справамі. Праз нейкі час прыбягае: «Я гатова рэпеціраваць!» Выходзіць у цэнтр пакоя: «Слова прадастаўляецца геніяльнаму дырэктару». Слова «генеральнаму» яна не ведала, таму прачытала «геніяльнаму». Я думаю, ён быў бы рады пачуць такое прадстаўленне *(усміхаецца)*.

— А хочаце я вам раскажу адну казку на памяць? Называецца «Сярэдзіна сасіскі» *(расказвае)*.

**Кацярына:** — Мы гэта яшчэ не запісвалі на YouTube. Трэба запісаць.

**— Дарыя, на тваім YouTube—канале падпісчыкаў нават больш, чым у маміным блогу. Навошта ты запісваеш гэтыя ролікі?**

— Каб дзеткі таксама больш чыталі і вучылі на памяць.

*У пакой забягае Данік з лейкай на галаве і пластмасавай клюшкай у руках. «Я жалезны дрывасек». «Ці можна далучыцца потым мне да тваёй гульні? — цікаўлюся. — І кім я магу быць?» — «Ты дзяўчынка, таму Элі», — абрадаваўся Данік.*

**— Дарыя, на адной з перадач ты сказала, што самая тоўстая кніжка, якую ты ведаеш на памяць, гэта «Чараўнік Ізумруднага горада».**

— Так *(дастае з кніжнай шафы)*. Тут цэлых шэсць тамоў. Мне яна вельмі падабаецца. Таму што там сябры ўвесь час адно аднаго абараняюць і стараюцца адно аднаму дапамагчы.

**— А праўда, што ты сваю кніжку цяпер пішаш?**

— Я збіраюся пісаць тры кнігі. Адна будзе называцца «Сяброўства-святло», пра сяброўства ад аднаго канца свету да другога. Другая кніжка пра пешку, якая згубілася, і яе шукаюць па лесе конь разам з іншымі шахматнымі фігурамі. Трэцюю назаву «Перламутравы цвік».

*Дарыя падбегла да сваёй куртачкі і дастала з кішэні маленькі цвік.*

— Я яго знайшла на «Золаце нацыі». Доўга разглядала і заўважыла, што ад яго ідзе маленькае чырвонае святло. Бачыце? Я яго цяпер з сабой нашу. Часам дастаю і расказваю маме. Кніга будзе пра хлопчыка, у якога ў кішэні быў цвік, але ён спачатку не ведаў, што ён чароўны. А потым з'явіліся тры вялікія сабакі, якія маглі выконваць усе яго жаданні.

**— Калі б табе на далоньку апусцілася знічка, што б ты ў яе папрасіла?**

— Каб ніхто з добрых людзей не хварэў.

*Восенню Дарыя пойдзе ў школу. Паказала мне сваю школьную форму: сінюю сукенку з беласнежнымі карункавымі манжэтамі і каўнерыкам.*

**— Вы яе ў нейкую адмысловую школу аддаяце?**

**Кацярына:** — Ды не, яна пойдзе ў школу, у якой вучыліся мая мама і я.

**— Не баіцеся, што з такой памяццю ёй будзе сумна на ўроках?**

— Сумна — гэта не пра Дарыю. Заўсёды ж можна паглядзець у акно і пафантазіраваць. Калі мы ехалі з Масквы ў цягніку, адна пажылая жанчына, што сядзела насупраць, вельмі перажывала, што «дзіця сумуе». «На табе цацку, пагуляй». На што Дарыя адказала: «Дзякуй, не трэба. Я гуляю. Я прыдумваю».

— Сары Кру ніколі не было сумна. Я хачу на яе быць падобнай. Быць такой, як Сара, няпроста. Але, я лічу, што я на яе ўжо крыху падобная.

**Кацярына:** — Ёсць мамы, якія не аддаюць дзетак у школу і самі праходзяць з імі ўсю школьную праграму. Але мне падабаецца займацца і сваімі праектамі. Я магу быць шчаслівай, толькі калі ў мяне ёсць нейкая любімая справа. А дзеці ж не могуць быць цалкам шчаслівымі, калі мама не шчаслівая. Таму Дарыя пойдзе ў школу. А дамашняе выхаванне школа не зусім адмяняе. Яно на ўсё жыццё.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

# ЧАМАДАНЫ ПРЫГАЖОСЦІ,

## або Эксклюзіўныя рэчы адной «касцюмеркі»

**Дарэвалюцыйныя ўпрыгажэнні і дамскія сумачкі на любы густ, рарытэтныя кнігі, якія сведчаць аб тым, як жанчыны ўсяго свету адзяваліся ў розныя эпохі, калекцыі сукенак і касцюмаў, каробкі з пальчаткамі, акулярамі і капелюшамі, чамаданы парасонаў і парыкоў, нават швейная машынка канца XVIII стагоддзя... Гэта не музей моды, не тэатральная касцюмерная і не кінастудыя «Беларусьфільм». Карэспандэнты «Звязды» завіталі ў прыватныя апартаменты, або, як іх называе сама гаспадыня, — у «касцюмерку».**



Для Дзіяны Слінко-Сіговай «касцюмерка» стала справай усяго жыцця.

### Рамонкі з бабуліных штор

Па прафесіі Дзіяна Слінко-Сігова — мастак-стыліст. Яна адзявае вядучых і гасцей Белтэлерадыёкампаніі, працуе над вобразамі герояў кінастужак, ставарае казку на галоўнай ёлцы краіны і святочную атмасферу на сталічных пляцоўках падчас маштабных урачыстасцяў. А пачалося ўсё са звычайнага захаплення маляваннем...

— Нарадзілася я ў вёсцы, дзе гуртком па выяўленчым мастацтве не было, — расказвае Дзіяна. — Творчыя заданні прыдумляла сабе сама: малявала ў школьную насценгазету, майстравала для ўласных лялек сукенкі з тканіны і фанцікаў. Аднойчы настаўнік заўважыў, чым я займаюся, і адвёз адну з маіх работ на рэспубліканскі конкурс. Мне прысудзілі адно з першых месцаў і запрасілі на ўступныя экзамены ў рэспубліканскую школу-інтэрнат па музыцы і выяўленчым мастацтве імя Ахрэмчыка. Правучылася там сем гадоў.

Але першай любоў да рукадзелля Дзіяне прывіла бабуля. Тая была знатнай ткачыхай, нават ткацкі станок магла адрамантаваць! Было дзяўчынцы і яшчэ ў каго павучыцца: адна цётка вышывала, другая ўвогуле была прафесійнай краўчыхай, якая адзявала ўсю сям'ю. Апошняя і прыцягвала Дзіяну да швейнай справы, калі тая прыязджала да бабулі на канікулы. Таму дзяўчынка з лёгкасцю магла адрозніць шоўк ад шэрсці, а таксама «абнавіць» бабуліны шторы, выразаўшы з іх рамонкі.

Дзіяна доўгі час пісала карціны, але прафесійным жывапісцам сябе ніколі не бачыла. Пасля заканчэння школы-інтэрната, што ўжо стала рэспубліканскім ліцэем мастацтваў, свае работы прывезла ў вёску. Бабуля, якая спявала ў царкоўным хоры, доўга не думала і занесла малюнкі на рэлігійную тэматыку ў царкву. Яны і дагэтуль там вісяць.

На аддзяленне керамікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў паступіла, каб навучыцца нечаму новаму. Паралельна асвойвала графіку і станковы жывапіс у Маскоўскім завочным універсітэце мастацтваў.

### Лялькі на ўдачу і світар для «Стыляг»

У дэкрэце Дзіяна асвоіла і яшчэ адзін від мастацкай дзейнасці. «Сябра нашай сям'і, вядомы акцёр Купалаўскага тэатра Мікалай Кучыц, шыў лялькі ў народным стылі: з распісанымі тварамі, у шыкоўных строях, — успамінае яна. — Падгледзеўшы, як ён гэта робіць, дзеля цікавасці таксама паспрабавала адну пашыць. Атрымалася вялікая, дзесьці 40 сантыметраў, — вельмі смешная і нязграбная. Зразумела, што трэба распрацаваць сваю ляльку, зручную па памеры для шыцця».

Пашытыя Дзіянай невялікія лялькі з тонкімі ножкамі, упрыгожаныя аксесуарамі і шматлікімі дэталямі, пачалі карыстацца папулярнасцю ў замежнікаў. Толькі для знаёмай немкі яна пашыла каля ста: дарэчы, вельмі падобных на папулярную сёння Цільду. Магчыма, менавіта Дзіяніна лялька трапіла ў рукі замежнаму мастаку, бо з'явіліся Цільды значна пазней, чым лялькі беларускай майстрыхі.

У той час, калі ўсе дзеці гулялі ў Барбі, у яе дачкі былі свае «сяброўкі». «Дачка часта засынала з маёй лялькай, часам з бязвокай, з адной заплеценай касой, — расказвае Дзіяна. — Раніцай мы прыводзілі цацку ў парадак, адшывалі новы нарад, і яна зноў ператваралася ў прынцэсу».

У лялькі, створаныя Дзіянай, гулялі дзеці амаль усяго інтэрната, дзе яны на той час жылі. Іх дарылі сябрам і знаёмым, незамужнім сяброўкам яны прыносілі ўдачу — тыя неўзабаве выходзілі замуж.

Іншае захапленне майстрыхі вылілася ў сур'ёзны праект. Спачатку яна вязала сабе, дачцэ, мужу, бацькам... Потым былі доўгія вечары з пруткамі ў кампаніі суседак па інтэрнаце. Звязаныя Дзіянай паліто і кепка прынеслі актрысе Купалаўскага тэатра Святлане Кажамякінай ролю ў кіно, а хутка і сама майстрыха стала абшываць зорак тэлеэкрана.

— Аднойчы маскоўскі мастак па касцюмах Саша Осіпаў прапанаваў мне звязаць некалькі рэчаў для герояў вядомай сёння кінастужкі «Стылягі», — расказвае Дзіяна. — Я настолькі захапілася, што за два месяцы звязала каля 60 мужчынскіх і жаночых камізэлек і світараў, у тым ліку той, чорна-белы з аленем, для галоўнага героя. Апошні, дарэчы, прыйшлося перарабляць: у першапачатковым варыянце рогі аленя глядзелі ў адзін бок.

### Эксклюзіў сярод хламу

Сёння ў Дзіяны — уласная калекцыя адзення, аксесуараў і самага рознага рэквізіту. Яна настолькі вялікая, што можна зняць не адну кінастужку, прычым на абсалютна розную тэматыку.

— Калі я пачала працаваць на тэлебачанні, адчула, што пры стварэнні пэўнага вобраза мне заўсёды нечага не хапала, — прызнаецца мастак-стыліст. — Сукенка прыгожая, а капялюшык зусім не той, ці аксесуар не з гэтай эпохі. Таму пачала нешта шыць сваімі рукамі, збіраць уласную калекцыю.

Штосьці яна набывае сама, нешта прывозяць сябры. А бывае і такое, што эксклюзіўныя рэчы амаль дарма аддаюць выпадковыя людзі. «Часам працуеш над пэўным праектам, дзе шмат масоўкі, хтосьці падыходзіць і пытаецца: «Ці не патрэбны вам рэчы, якія я насіла ў юнацтве?», — расказвае Дзіяна. — Ну як ад такога адмовішся? Наступны раз мая масоўка прыходзіць з торбачкамі, і мне ўжо трэба ехаць дамоў на таксоўцы».

Праўда, перш Дзіяна ўсё непатрэбнае сцягнула ў сваіх родных. Мама была моцна здзіўлена: маўляў, навошта табе гэты хлам? Але менавіта ён, па словах мастачкі, часам вельмі неабходны. Як, напрыклад, было з каробкай для капелюшоў, якую яна ўбачыла ў кватэры аднаго дзядулі. У ёй, рарытэтнай, 1960-х гадоў, ён захоўваў розную дробязь. І вельмі здзівіўся, калі Дзіяна прапанавала за яе грошы...

— Неяк паехала да адной бабулі набываць кнігу, — успамінае яшчэ адну цікавую гісторыю Дзіяна. — Раптам яна паказвае мне старую швейную машынку. Ды яшчэ з гісторыяй! Аказваецца, машынку неаднойчы хавалі ў вайну, каб немцы не адабралі. Дасталася мне яна вельмі танна.

Але гатова яна дзеля эксклюзіўнай рэчы ахвяраваць і большымі грашыма. Напрыклад, так было з яшчэ дарэвалюцыйнымі «акулярамі Берыі», як называе іх майстрыха. «Пэўныя рэчы знаходзіш на аўкцыёнах. Нешта на барахолках, стыхійных рынках, дзе сярод звычайных прадметаў часта заўважаеш нешта эксклюзіўнае, — працягвае мастак-стыліст. — Часам ідзеш і не задумваешся аб тым, што нешта купіш. Гэта як на рыбалцы: не ведаеш, што зловіш. Такі азарт!»

Абавязкова пасля паходу па рынках Дзіяна прыцягне ў «касцюмерку» чарговы чамадан. «Проста ў іх зручна ўсё захоўваць», — прызнаецца яна і паказвае на чамаданы з шалямі, гальштукамі, каўнерыкамі, пальчаткамі...

Кожная рэч з «касцюмеркі» знаходзіць сваё прымяненне: падчас шматлікіх мерапрыемстваў, фотаздымкаў, з задавальненнем іх бяруць на карпаратывы, выкарыстоўваюць у кіно. Апошні буйны праект, над якім працавала Дзіяна, — шматсерыйны фільм Белтэлерадыёкампаніі «Міліцыя ў асобах», прымеркаваны да 100-годдзя беларускай міліцыі.

— Гэта ўнікальны вопыт у маёй творчай дзейнасці: у адным фільме трэба было паказаць усе эпохі, пачынаючы з 1917 года да сучаснасці, — расказвае мастак-стыліст Белтэлерадыёкампаніі. — У фільме ў асноўным здымаліся курсанты Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў, маладыя хлопцы да 25 гадоў. Часам адных і тых жа акцёраў здымалі ў розных эпохах, а значыць паказвалі ў якасці розных людзей. Вельмі цікава было назіраць, як юнакі ператвараліся ў дарослых мужчын.

* * *

У тым, што Дзіяна — майстар пераўвасаблення, удалося пераканацца асабіста. Маладая матуля Каця, якая прыйшла ў «касцюмерку» з чатырохгадовай дачкой Вікай *(на фота)*, за некалькі хвілін з сучасных моднiц ператварыліся ў кабет 1920-х гадоў. Прымяралі на сябе і іншыя «эпохі». І трэба сказаць, настолькі захапіліся, што ў такіх вобразах гатовыя былі сысці дамоў...

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*





Фота Надзеі БУЖАН.

■ Фотаздымак з гісторыяй

# «Жанчыны дарылі нам кветкі, частавалі віном...»



Нядаўна выпадкова знайшоў стары нумар «Народнай газеты» за 1—3 ліпеня 1995 года і прыгадаў, што больш за дваццаць гадоў таму мне даў яго дзядуля — Шастакоў Пётр Іосіфавіч. Тады на адным з фотаздымкаў, прысвечаных падзеям вызвалення Мінска ад нямецкіх акупантаў, ён пазнаў сябе. Дзядуля стаяў сярод іншых салдат-вызваліцеляў (чацвёрты справа з супрацьтанкавым ружжом на плячы). Да пачатку вайны Пётр Іосіфавіч паспеў скончыць чатыры курсы гістарычнага факультэта БДУ, а 3 ліпеня 1944 года — ён, сяржант Савецкай Арміі, знаходзіўся ў Мінску ў складзе 1174-га палка 348-й стралковай дывізіі.

«У той памятны дзень, — расказваў дзядуля, — нам загадалі прачэсваць двары і вуліцы ў цэнтры Мінска. Ворагаў у горадзе мы не сустрэлі, а ў скверы каля Дома афіцэраў былі акружаны жыхарамі сталіцы. Жанчыны дарылі нам кветкі, частавалі віном. Аднекуль з'явіўся фатограф у цывільным і зрабіў некалькі здымкаў».

Далейшы шлях дзядулі праходзіў праз Кёнігсберг, а Перамогу ён сустрэў у Польшчы. Пасля вайны скончыў універсітэт і да самай пенсіі працаваў настаўнікам гісторыі ў школе.

Вось ужо амаль дваццаць гадоў, як яго не стала, але памяць пра дзядулю жывая. І не толькі на старым ваенным фотаздымку, але і ў нашых сэрцах.

**Максім ШАСТАКОЎ.**

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома. Здымкі (не больш за тры) з невялікай гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца***

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | Капитальное строение, инв. № 450/С-18987 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – павильон «Ландыш»), площадью 93,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Подлесная, 3 |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 425450100001008154, площадью 0,0615 га. (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания дома быта «Ландыш») по адресу: г. Слоним, ул. Подлесная, 3 |
| Начальная цена продажи | 33 480 р. (тридцать три тысячи четыреста восемьдесят рублей) |
| Сумма задатка | 3 348 р. (три тысячи триста сорок восемь рублей) |
| Условия аукциона | Без условий |
| Наименование подразделения департамента | Берестовицкий межрайонный отдел управления по Гродненской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь |
| Уполномоченный орган | ИМНС Республики Беларусь по Слонимскому району |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| Условия оплаты | В течение 20 (двадцати) рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона |
| Номер р/с для перечисления задатка | 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 13 июня 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
- *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица, копия устава;
- *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
- *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

- представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
- физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
- представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом в соответствии с шагом аукциона в размере 5% от предыдущей цены до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) обязано возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней. Размер затрат доводится до сведения участников непосредственно перед торгами.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 7 июня 2017 г. до 15.00.**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/*

---

*Уважаемые акционеры ОАО «Рапс»* УНП 600068480

**22 мая 2017 года**

состоится внеочередное общее собрание акционеров

## ОАО «Рапс»,

расположенного по адресу: Минская область, Минский район, 223014, аг. Крупица.

*Собрание пройдет по адресу: Минская область, Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, д. 20, административное здание ОАО «Рапс», первый этаж, актовый зал.*

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. Утверждение результатов закрытой подписки на акции дополнительного выпуска;
2. Утверждение решения о выпуске акций;
3. Об увеличении уставного фонда Общества на сумму подписки;
4. О внесении изменений в Устав Общества в связи с увеличением уставного фонда.

*С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: Минская область, Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, 20, ОАО «Рапс» (кабинет юрисконсульта), в рабочие дни (понедельник – пятница) с 12 мая 2017 г. по 19 мая 2017 г. (время работы с 13.00 до 16.00) либо 22 мая 2017 г. по месту проведения собрания.*

Регистрация участников собрания с 10.00 до 11.00 по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания – 22 мая 2017 г. в 11.00.**

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров: 12 мая 2017 года.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность, заверенную в установленном порядке.**

*Справки по тел. 8 (017) 5069211*

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | Капитальное строение, инв. №400/С-4285 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – производственный корпус №2), площадью 3034,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Карского, 35 |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 440100000002007199 (назначение – земельный участок для обслуживания здания производственного корпуса №2), площадью 0,6280, расположенном по адресу: ул. Карского, 35 |
| Обременения со стороны 3 лиц | В виде аренды:<br>- 138 кв. м до 31.05.2017 г.<br>- 209,6 кв. м до 31.01.2018 г.<br>- 624,1 кв. м до 31.01.2018 г.<br>- 202,5 кв. м до 01.07.2017 г. |
| Начальная цена продажи | 523 809,52 р. (пятьсот двадцать три тысячи восемьсот девять рублей пятьдесят две копейки) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 26 190 р.<br>(двадцать шесть тысяч сто девяносто рублей) |
| Условия аукциона | Аукцион без условий |
| Продавец | ОАО «Гроднооблавтотранс»,<br>230023, г. Гродно, ул. Ожешко, 25,<br>тел. 72-19-57, факс 72-19-84 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 9 июня 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 16.11.2016 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 5 июня 2017 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

*http://grodnoino.by/*

---

О РЕАЛИЗАЦИИ ИМУЩЕСТВА

## ОАО «Монтажлегмаш»

| | |
|---|---|
| Сведения об организации торгов | Ликвидатор – частное предприятие «Бизнес Центр Консалт»: 212030, г. Могилев, пер. Буянова, д. 19, оф. 14 |
| Продавец | ОАО «Монтажлегмаш» (УНП 700099371): 212030, г. Могилев, Славгородское шоссе, 173 |
| Форма, дата, время и место проведения торгов | Первые торги в форме открытого аукциона 16.06.2017 в 15.00 по адресу: 212039, г. Могилев, Славгородское шоссе, 173 |
| Сведения о предмете торгов и порядок ознакомления с ним | Объекты недвижимости, расположенные по адресу: 212030, г. Могилев, Славгородское шоссе, 173.<br>Более подробную информацию можно получить по телефонам: 73-58-60, 8029 644-90-55, в рабочие дни с 09.00 до 15.00 |
| Предмет торгов | **Лот №1** – гараж для автомашин – 19 000,00 бел. руб.<br>**Лот №2** – бытовое помещение – 2 000,00 бел. руб. |
| Порядок проведения торгов | Шаг аукциона – 5%. Победителем торгов будет объявлено лицо, предложившее наибольшую цену. Договор купли-продажи подписывается в 20-дневный срок с даты подписания протокола по результатам торгов. В случае признания торгов несостоявшимися продажа предмета аукциона претенденту на покупку при его согласии осуществляется по начальной цене, увеличенной на 5% |
| Размер, порядок и сроки внесения задатка | Задаток в сумме 10% от стоимости предмета торгов перечисляется до подачи заявления на расчетный счет продавца (р/с 3012112521002 в ОАО «Банк БелВЭБ», код 226) |
